В. М. Данілаў

Выяўленчае мастацтва і праца

Тэматычнае планаванне

2 клас



Выданне складаецца з метадычных рэкамендацыяў, якія дапамогуць настаўніку правільна арганізаваць і правесці ўрокі выяўленчага мастацтва ў II класе, паспрыяюць абуджэнню ў дзяцей пачуцця прыгожага, любові да мастацтва, павагі да лепшых культурных традыцыяў.

Рэкамендуецца настаўнікам пачатковых класаў сярэдніх школ, студэнтам і навучэнцам педагагічных устаноў.

Рэкамендавана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь

Выяўленчае мастацтва ў школе



2

ВАРЫЯНТ ПРАГРАМЫ. ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ

Змест сярэдняй адукацыі павінен адлюстроўваць увесь сацыяльны вопыт грамадства ў яго асноўных элементах. У сувязі з гэтым у 1995 годзе перапрацаваны і зацверджаны новыя навучальныя праграмы па выяўленчаму мастацтву, якое, побач з іншымі школьнымі прадметамі, адыгрывае важную ролю ў гарманічным развіцці асобы дзіцяці. У праграмах дакладна сфармуляваны задачы, асноўныя патрабаванні да выкладання мастацтва ў школе, вызначаны змест навучальнага матэрыялу. Паколькі існуе некалькі варыятыўных праграм, ёсць сэнс параўнаць іх.

Праграма 1 – гэта варыянт, распрацаваны ў НДІ школ Міністэрства адукацыі Расіі пад кіраўніцтвам В.С. Кузіна, М.М. Растоўцава. Яна з'яўляецца зараз базавай для школ Расіі.

Па структуры і зместу яна ўяўляе мадэрнізаваны варыянт традыцыйнай праграмы – па якой навучаюць дзяцей з 1970 года. Мэта гэтай праграмы – навучыць школьнікаў асновам выяўленчай пісьменнасці, уменню маляваць. Агульныя эстэтычныя задачы рашаюцца тут фармальна, ініцыятыва належыць у асноўным настаўніку, вучні ж выступаюць у ролі пасіўных выканаўцаў. Акрамя таго, праграма не прадугледжвае ўрокаў лепкі і канструявання. Асноўныя віды дзейнасці на занятках – маляванне з натуры, маляванне на вызначаныя тэмы, дэкаратыўнае маляванне і гутаркі па мастацтву.

Праграма 2, якую ў свой час распрацаваў калектыў вучоных НДІ мастацкага выхавання АПН СССР пад кіраўніцтвам Б.П. Юсава, з 1982 года лічыцца тыпавой для школ Беларусі. Яна мае істотныя адрозненні ад ранейшых праграм: уведзены ўрокі лепкі, раздзел "Гутаркі аб мастацтве" заменены раздзелам "Успрыманне мастацтва і аб'ектаў рэчаіснасці", што дае магчымасць больш глыбока і сістэмна раскрываць сувязь мастацтва і рэчаіснасці. Пашыраюцца і віды дзейнасці школьнікаў на ўроках. Гэта адлюстраванне на плоскасці, лепка, дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць, зрокавае і слыхавое ўспрыманне. Недахоп праграмы ў адсутнасці тэматычнай цэласнасці навучальнага матэрыялу на год і чвэрці.

Праграма 3 "Выяўленчае мастацтва і мастацкая праца" – вынік сумеснага пошуку НДІ мастацкага выхавання і Саюза мастакоў СССР пад кіраўніцтвам Б.М. Неменскага. У новай рэдакцыі яна выйшла ў 1988 годзе і ўяўляецца найбольш аптымальнай. Асноўныя віды мастацкай практычнай дзейнасці – адлюстраванне, упрыгожванне, будаванне.

Галоўнай мэтай выкладання выяўленчага мастацтва ў школе з'яўляецца фарміраванне ў школьнікаў мастацкай культуры як неад'емнай часткі культуры духоўнай. Праграма вызначае сукупнасць, адзінства, агульнасць асноўных навучальна-выхаваўчых задач:

фарміраванне эстэтычнай культуры і духоўнага свету школьнікаў на основе нацыянальных і агульна-чалавечых каштоўнасцей;

развіццё мастацкіх здольнасцей і творчай актыўнасці вучняў;

удасканаленне зрокавага ўспрымання школьнікаў, развіццё назіральнасці, вобразнага мыслення, фантазіі, пачуцця кампазіцыі, колеру, прасторы;

фарміраванне ў дзяцей уменняў і навыкаў аб'ектыўна ўспрымаць, аналізаваць творы мастацтва ўсіх відаў і напрамкаў, засваенне нацыянальнай і сусветнай культуры, авалоданне імі вобразнай мовай пластычных мастацтваў праз фарміраванне мастацкіх ведаў, уменняў і навыкаў;

навучанне школьнікаў асновам выяўленчай, дэкаратыўнай і канструктыўнай дзейнасці, уменню ствараць адзіны мастацкі вобраз.

Праграма "Мастацкая творчасць", якую прапануем мы, уяўляе сістэму навучальных і творчых заданняў, накіраваных на развіццё асобы дзіцяці ў адзінстве пазнання і творчасці.

Для вызначэння аптымальнага зместу яе былі прааналізаваны праграмы па выяўленчаму мастацтву Венгрыі, Японіі, Украіны, Казахстана, Малдавіі, Літвы, Латвіі, Расіі. Складаецца яна на аснове "Канцэпцыі мастацка-эстэтычнай адукацыі ў нацыянальнай школе Беларусі" (М. Селязнёў і інш.),праграм, распрацаваных пад кіраўніцтвам В. Кузіна, Б. Юсава, Дз. Кабалеўскага, Б. Неменскага, з ўлікам сучасных тэхналогій і заканамернасцей выкладання мастацтва ў школе, з апорай на тэматыку і змест праграмы Б. Неменскага "Выяўленчае мастацтва і мастацкая праца".

Параўнальны аналіз эксперыментальных і тыпавых праграм дазволіў вылучыць адзіныя патрабаванні да зместу і метадаў выкладання мастацтва ў школе:

сувязь з жыццём, адзінства адукацыі і выхавання;

узаемасувязь пазнання і творчасці тэматычнасць праграмы;

развіццё ў школьнікаў цікавасці да выяўленчага мастацтва, міжпрадметнасць, інтэгратыўнасць мастацкай дзейнасці;

разнастайнасць відаў мастацкай дзейнасці;

дыферэнцыраваны падыход і індывідуальнасць

творчасці;

аптымальнае спалучэнне індывідуальных і калектыўных формаў работы;

творчая актыўнасць, супрацоўніцтва вучня і настаўніка.

Блокава-тэматычная структура праграмы складаецца з дакладна акрэсленых пазнавальных тэматычных "гарызанталей" (тэмы па класах, чвэрцях, блоках), якія змяшчаюць у сабе "вертыкалі" мастацкіх навучальных задач (форма, колер, прастора і г.д.).

Тэматыка навучальнага матэрыялу па класах дапаўняецца тэмамі па чвэрцях і канкрэтызуецца тэмамі блокаў, урокаў.

Мастацкія веды, уменні і навыкі школьнікаў групуюцца сістэмай навучальных задач мастацкай творчай дзейнасці: "Кампазіцыя–вобраз", "Пазнанне–успрыманне", "Форма–змест", "Колер–каларыстыка", "Прастора–аб'ём", "Тэхналогія–тэхніка".

Мастацкая творчасць развіваецца праз комплекс пластычных мастацтваў, ў якім вылучаюцца тры спосабы мастацкага асваення рэчаіснасці: выяўленчы, дэкаратыўны, канструктыўны. Гэтыя віды дзейнасці лёгка суадносяцца з "трыма майстрамі" праграмы Б. Неменскага (выяўленне, упрыгожванне, будаванне), што забяспечыць даволі лёгкі пераход да новай праграмы.

Галоўныя тэмы адзінага "Ядра" праграм – "Азбука мастацтва" (1 кл.), "Мастацкі вобраз" (2 кл.), "Мастацтва вакол нас" (3 кл.), "Нацыянальная і сусветная мастацкая культура" (4 кл.) – адаптуюць настаўніка і вучня за пераходны перыяд да асваення тэхналогіі і зместу новай праграмы.

Праграма "Мастацкая творчасць" распрацоўвалася як інтэграваны курс, які разлічаны на 2 гадзіны ў тыдзень у кожным класе пачатковай школы.

Асноўныя мастацкія матэрыялы і тэхнікі, якія прымяняюцца на ўроках мастацкай творчасці

Выяўленне (маляванне, лепка): простыя алоўкі, каляровыя алоўкі, васковая крэйда, фламастэры, туш, манатыпія, гравюра, гуаш, акварэль, аплікацыя, мазаіка, калаж, пластылін, гліна.

Дэкор (упрыгожванне): каляровыя алоўкі, фламастэры, гуаш, аплікацыя, калаж, выцінанка, штамп, фларыстыка, саломка, пляценне, вітраж, бацік, трафарэт, шрыфт, вышыўка, роспіс, рэльеф, гліна.

Дызайн (канструяванне, мадэліраванне, праектаванне): папера "арыгамі", кардон, прыродныя матэрыялы, розныя матэрыялы, пластылін, гліна, пластыка, дрэва, фанера, метал, дрот, тканіна, паралон, пенапласт, "Канструктар".



Асноўныя тэмы гутарак па мастацтву

II клас

1. Як і чым творыць мастак? Мастацкія матэрыялы і прылады.
2. Выяўленне, канструяванне, дэкор – тры спосабы мастацкай дзейнасці. Фантазія і рэальнасць. Тры майстры.
3. Мой любімы мастак і яго работы (паўтарэнне відаў мастацкай дзейнасці – выяўлення, канструявання, дэкарыравання).
4. Вобраз у выяўленчым мастацтве (прырода, жывёла, чалавек). Вобразы ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Выразныя сродкі. Вобразы ў архітэктуры і дызайне.
5. Як гаворыць мастацтва (мова мастацтва)? Выяўленчыя мастацкія сродкі: форма, колер, абъем, кантраст, рытм, лінія.
6. Кампазіцыя. Сінтэз сродкаў мастацкай выразнасці. Праца мастака над творам. Тэхніка, індывідуальнасць мастака (абагульненне за II клас).





Я – МАСТАК

Планаванне ўрокаў па выяўленчаму мастацтву ў II класе грунтуецца на аснове новай праграмы "Мастацкая творчасць". Калі першакласнікі вучацца бачыць прадметны свет і перадаваць яго ў мастацкіх вобразах, то ў II класе фарміруюцца ўяўленні дзяцей аб мастацтве выяўлення, упрыгожвання і канструявання, аб мастацкіх вобразах і мове, на якой "гавораць" выяўленчае мастацтва, мастацкія рамёствы і дызайн. Другакласнікі атрымліваюць веды па культуры мастацтва, вучацца практычна-мастацкай дзейнасці ў розных яе відах. Вялікае значэнне надаецца развіццю ў школьнікаў мастацкага густу, фарміраванню паняццяў аб мастацкім вобразе і яго асобаснай ацэнцы. Пазіцыя "я – мастак" – найбольш актыўная і аптымальная для развіцця самасвядомасці і творчага „Я" вучняў.

Урокі "Мастацкай творчасці" патрабуюць актыўнай узаемасувязі з прадметамі школьнага цыкла „Музыка і спевы", "Чалавек і свет", а таксама з такімі, як "Асновы тэатральнай дзейнасці", "Дызайн і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва". Акрамя таго, вельмі карыснай з'яўляецца пазакласная работа па розных відах выяўленчага мастацтва.

1 чвэрць

Чым і як працуюць мастакі?

У I чвэрці школьнікі паслядоўна замацоўваюць даступныя мастацкія тэхнікі (маляванне, лепку, роспіс, аплікацыю і інш.) у выкананні рознымі мастацкімі матэрыяламі (алоўкам, фламастэрам, крэйдай, фарбамі і да т.п.). Выбар тэхнікі і матэрыялаў па жаданню дае дзіцяці магчымасць лепш пазнаць мастацкую творчасць, выразіць сваю творчую індывідуальнасць. На працягу чвэрці другакласнікі вучацца прыёмам і спосабам працы мастака-жывапісца, графіка, дызайнера, кераміста.

З першых урокаў пачынаецца і сістэматычнае азнаямленне вучняў са слоўнікам мастацкіх тэрмінаў і паняццяў.

Педагагічнае кіраўніцтва творчасцю дзяцей II класа патрабуе ад настаўніка абавязковай дэманстрацыі твораў мастацтва, практычных прыёмаў и спосабаў творчай дзейнасці, розных мастацкіх матэрыялаў і дыдактычна правільнага паказу іх асаблівасцей і магчымасцей.

ТЭМА ПРАГРАМЫ: "ШКОЛА ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА"

УРОК 1

Тэма: "Аловак, фламастэр, туш. У майстэрні мастака-графіка". Маляванне.

Мэта: узнавіць веды дзяцей аб разнастайнасці матэрыялаў, якія прымяняюцца ў малюнку, і правілах карыстання імі;удасканальваць уменне выбіраць для работы паперу патрэбнага фармату і гарманічна запаўняць ліст графічнымі вобразамі; выхоўваць пазнавальную актыўнасць, творчае ўяўленне і настойлівасць у дасягненні мэты.

Абсталяванне: гравюры і графічныя рэпрадукцыі Я. Чарушына, Ю. Васняцова, Е. Рачёва і іншых аўтараў, карта "Краіна мастацтваў", папера белага колеру, алоўкі, фламастэры, шарыкавая ручка, вугаль, туш, пэндзлі.

Змест. Ва ўступнай гутарцы "Падарожжа ў краіну Графіку" дзеці знаёмяцца з паняццямі "лінія", "штрых", "контур", "кантраст". Разглядваючы гравюры і графічныя рэпрадукцыі, яны засвойваюць уяўленні аб выразнасці і разнастайнасці ліній (прамыя, хвалістыя, тонкія, тоўстыя, перасякальныя), графічных тэхнік, матэрыялаў. Адказы вучняў на пытанне "Чым і як працуе мастак-графік?" абмяркоўваюцца, настаўнік дапаўняе і ўдакладняе іх.

У практычнай дзейнасці выпрацоўваецца ўменне маляваць разнастайныя лініі рознымі інструментамі (ручкай, алоўкам, тушшу, вугалем). Потым дзеці малююць адказы на пытанні: што бывае круглым, квадратным, калючым, калматым і г.д.? Матэрыялы і спосабы малявання вучні выбіраюць самі.

Заключная частка ўрока адводзіцца для абмеркавання і аналізу работ, абагульнення пройдзенага матэрыялу. Узор аналізу дае настаўнік. Вучні адказваюць на пытанні тыпу: з якім відам мастацкай дзейнасці пазнаёміліся на ўроку? Назавіце матэрыялы і тэхнікі графічнага малюнка. Назавіце мастакоў-графікаў, работы якіх разглядалі. І да т.п.

Заданне на дом: падабраць дзіцячыя кніжкі з графічнымі малюнкамі, скласці невялічкае паведамленне па аднаму з малюнкаў.

УРОК 2

Тэма: "Каляровая крэйда". Графічнае маляванне.

Мэта: пашыраць уяўленне вучняў аб працы мастака-графіка, ілюстратара кніжак; вучыць дабівацца мастацкай выразнасці малюнка каляровымі лініямі і штрыхамі; фарміраваць цікавасць да кніжнай графікі, выхоўваць настойлівасць ў дасягненні мэты.

Абсталяванне: гравюры, альбом "Мастак і кніга", ілюстраваныя дзіцячыя кнігі, узорныя малюнкі настаўніка, папера белага колеру, васковая крэйда, фламастэры, каляровыя алоўкі.

Змест. Завочная экскурсія ў майстэрню мастака-гравера з выкарыстаннем гравюр, дзіцячых кніг, ілюстраваных графічнымі малюнкамі. Дзеці знаемяцца са значэннямі слоў **гравюра, эстамп, ілюстрацыя, контур, кантраст.** Настаўнік паказвае прыемы графічнага малявання каляровымі алоўкамі, васковай крэйдай, звяртае ўвагу на выразнасць каляровай лініі і штрыха, вучыць выкарыстоўваць у малюнку розныя прылады працы – фламастэр і каляровыя алоўкі, чорную шарыкавую ручку і каляровую крэйду. Разам з настаўнікам вучні практыкуюцца ў накладванні рознакаляровых штрыхоў адзін на адзін, размалёўванні каляровай крэйдай чорнага контуру, выкананага фламастэрам.

У гульні "Рознакаляровыя сябры" дзеці самастойна замацоўваюць прыемы малявання крэйдай у спалучэнні з іншымі матэрыяламі. Тэматыку малюнка яны выбіраюць самі.

Пад час аналізу работ замацоўваюцца тэрміны і паняцці па графіцы.

Заданне на дом: прыдумаць казку-расфарбоўку аб каляровых крэйдах.

УРОК 3

Тэма: "Гуаш (тры колеры). У майстэрні жывапісца". Маляванне.

Мэта: узнавіць і паглыбіць веды дзяцей аб асноўных і састаўных колерах; развіваць пачуццё каляровай гамы; фарміраваць навыкі працы з пэндзлямі, уменне змешваць фарбы для атрымання неабходных колераў; замацоўваць веды аб матэрыялах і прыладах працы мастака-жывапісца.

Абсталяванне: рэпрадукцыі карцін, каляровая табліца, папера белага колеру, фарбы гуаш, пэндзлі розных памераў.

Змест. Настаўнік дэманструе 1–2 рэпрадукцыі і расказвае аб шляхах стварэння жывапісных твораў. Дзеці даведаюцца, што карціны пішуць пэндзлямі на палатне, паперы, змешваючы на палітры розныя фарбы для атрымання разнастайных колераў. Фарбы бываюць розныя: алейныя, темперныя, акварэльныя, гуашавыя. Ведаючы, напрыклад, сакрэты трох фарбаў (чырвоная, жоўтая, сіняя), можна расфарбаваць у розныя колеры ўвесь свет. Што ж гэта за сакрэты?

Разам з настаўнікам вучні размешваюць фарбы, атрымліваюць розныя колеры і іх адценні, засвойваючы паняцці аб асноўных і састаўных колерах, іх адценнях. Замацоўваюцца атрыманыя навыкі ў самастойнай практычнай дзейнасці дзяцей. Яны малююць "клумбу чароўных кветак", розных па форме, велічыні, афарбоўцы, карыстаючыся пэндзлямі розных памераў.

У канцы ўрока вучні аналізуюць свае работы, расказваючы пра матэрыялы и прылады працы, якімі карысталіся пры выкананні задання, спосабах атрымання неабходных колераў і іх адценняў.

Заданне на дом: намаляваць казку пра фарбы.

УРОК 4

Тэма: „Гуаш каляровая + белая + чорная". Маляванне.

Мэта: вучыць дзяцей атрымліваць розныя колеры шляхам змешвання асноўнай фарбы з белай або чорнай; фарміраваць пачуццё каляровай гармоніі, удасканальваць уменне працаваць пэндзлем і гуашавай фарбай; выхоўваць акуратнасць у рабоце.

Абсталяванне: табліца "Каляровы круг", рэпрадукцыі з карцін, папера белага колеру, пэндзлі, гуаш.

Змест. Ва ўступнай гутарцы дзеці знаемяцца з трыма асноўнымі і трыма састаўнымі колерамі – пачаткам шматкаляровай палітры акружаючага нас свету. Белая і чорная фарбы павялічваюць колькасць магчымых каляровых спалучэнняў. Прычым белая фарба надае колеру лёгкасць, пяшчоту, а чорная – робіць яго сумным, змрочным, цяжкім. Упэўніцца ў гэтым вучням дапамагаюць дадатковыя практыкаванні, якія яны выконваюць пад кіраўніцтвам настаўніка.

У практыкаванні "Каляровы круг" дзеці самастойна змешваюць асноўныя фарбы, атрымліваючы шасціступенчаты круг, потым дабаўляюць у кожную з іх белую фарбу, надаючы ім светлае, пяшчотнае адценне. Паўтарыўшы працэс змешвання асноўных фарбаў, дабаўляюць у атрыманыя колеры чорную, якая робіць іх змрочнымі.

Выстава работ дазволіць убачыць разнастайнасць каляровай гамы і замацаваць уяўленне аб яе атрыманні.

Заданне на дом: скласці паведамленне "Прырода ў творах мастакоў" на аснове асабістых назіранняў.

УРОК 5

Тэма: "Гуаш каляровая + белая + чорная". Карціны прыроды". Маляванне.

Мэта: удасканальваць зрокавае ўспрыманне дзяцей; дабівацца творчага выкарыстання ўяўлення і фантазіі ў працэсе адлюстравання імі навакольнага свету; замацоўваць навыкі змешвання фарбаў, уменне працаваць пэндзлямі розных памераў, выхоўваць пачуццё прасторы пры размяшчэнні выяў на плоскасці ліста.

Абсталяванне: музычныя творы П.І. Чайкоўскага "Поры года", Ф. Ліста "Пачатак буры" ў грамзапісе, ілюстрацыі твораў І. Айвазоўскага "Штыль", "Дзевяты вал", І. Левітана "Вялікая вада", В. Васільева " Мокры луг", А. Куінджы "Ноч над

Дняпром" і інш., каляровая табліца, папера белага колеру, фарбы гуаш, пэндзлі розных памераў.

Змест. Дзеці слухаюць музыку, разглядваюць ілюстрацыі, знаёмяцца з паняццем "стыхія". Настаўнік паказвае прыемы, пры дапамозе якіх мастакі адлюстроўваюць у сваіх творах стан прыроды (буру, навальніцу, туман і г.д.). Выбраўшы і абмеркаваўшы змест твора, вучні вялікімі пэндзлямі пад кіраўніцтвам настаўніка пачынаюць работу над малюнкам. Фарбы змешваюцца на рабочай паверхні ліста паперы, а не на палітры: каляровымі плямамі па тыпу падмалеўкі запаўняецца ўвесь ліст. Адзін колер упісваецца ў другі, упрыгожваючы яго, а не зліваючыся з ім канчаткова. Гэта асноўны фон малюнка. Характэрныя дэталі пэйзажу дамалёўваюцца пэндзлямі меншых памераў.

Аналізуе работы настаўнік, які асаблівую ўвагу вучняў звяртае на разнастайнасць каляровай гамы ў прыродзе і магчымасці фарбаў, пры дапамозе якіх мастак можа адлюстраваць любыя з'явы прыроды.

Заданне на дом: разглядзець і зрабіць замалёўкі фрагментаў узораў дываноў, падрыхтаваць кардонныя палоскі для наступнага ўрока.

УРОК 6

Тэма: "Аплікацыя дэкаратыўная. Дыванок для цацак"

Мэта: знаёміць дзяцей з мастацтвам народнага арнаменту, матэрыяламі і тэхнікамі дэкаратыўнай дзейнасці (вышыўкай, ткацтвам, аплікацыяй); вучыць аналізаваць і складаць узор, выкарыстоўваючы рытм, сіметрыю, каларыт; удасканальваць прыёмы аплікацыі, выхоўваць самастойнасць.

Абсталяванне: прадметы быту (вышытыя і тканыя ручнікі, дыванкі, абрусы), узоры арнаментаў, табліца "Каляровы круг", белая і каляровая папера, нажніцы, клей, памазок, аловак, лінейка.

Змест. Настаўнік знаёміць вучняў з мастацтвам народнага арнаменту і творамі народных майстроў. Асаблівую ўвагу звяртае на разнастайнасць тэхнікі выканання (вышыўка, ткацтва, пляценне, выцінанка, аплікацыя) і тлумачыць значэнне паняццяў і тэрмінаў "сіметрыя", "рытм", "сілуэт", "каларыт".

План работы па вырабу дыванка для цацак у тэхніцы аплікацыі абмяркоўваецца і складаецца калектыўна. Настаўнік паказвае прыёмы выразання элементаў арнаменту (квадрацікаў, палосак). Дзеці пры дапамозе алоўка і лінейкі робяць эскіз узора, падбіраюць колеры фону і элементаў кампазіцыі, раскладваюць дэталі на аснове, потым акуратна замацоўваюць іх пры дапамозе клею.

Аналізуючы работы, настаўнік асаблівую ўвагу звяртае на паўтарэнне дзецьмі спецыяльных тэрмінаў.

Заданне на дом: падрыхтаваць прыродны матэрыял для вырабу дыванка ў тэхніцы фларыстыкі.

УРОК 7

Тэма: "Аплікацыя дэкаратыўная". Фларыстыка.

Мэта: вучыць дзяцей складаць дэкаратыўную кампазіцыю з матэрыялаў флоры; пашыраць уяўленні аб мастацкіх магчымасцях разнастайных прыродных матэрыялаў, фарміраваць навыкі практычнай дзейнасці з названым матэрыялам; выхоўваць уменне адчуваць прыгажосць і гармонію элементаў мастацкага вобраза.

Абсталяванне: узоры дэкаратыўных кампазіцый, калекцыя лістоў і пялёсткаў рознай формы, велічыні, белая і каляровая папера, клей, памазок, нажніцы.

Змест. Дзеці знаёмяцца з паняццямі "флора": "фларыстыка", разглядваюць узоры кампазіцый, якія выкананы ў гэтай тэхніцы. Асаблівая ўвага надаецца тлумачэнню і паказу этапаў работы па фларыстыцы. Спачатку падбіраюцца аднолькавыя па форме, памерах, афарбоўцы лісточкі і пялёсткі, затым, шляхам паўтарэння і чаргавання матэрыялу, выкладваецца узор.

Дзеці самастойна прыдумваюць кампазіцыю сваіх твораў, падбіраюць неабходныя матэрыялы і замацоўваюць дэталі ўзора на аснове.

У канцы ўрока работы аналізуюцца. Вучні узнаўляюць прыёмы працы з прыродным матэрыялам, тэрміналогію. Настаўнік падводзіць вынікі заняткаў.

Заданне на дом: зрабіць замалёўкі прасцейшых цацак-самаробак, падрыхтаваць неабходны для іх вырабу матэрыял.

УРОК 8

Тэма: "Папера, клей (дызайн)". Канструяванне.

Мэта: даць уяўленне аб асноўных прынцыпах дызайну – спалучэнне прыгажосці, практычнай неабходнасці і прастаты вырабаў; фарміраваць навыкі і прыёмы канструявання з паперы (складванне, згінанне, выразанне, упрыгожванне); развіваць камбінаторыку, зрокавую памяць, творчую ініцыятыву дзяцей.

Абсталяванне: узоры дызайн-праектаў, карткі-схемы з адлюстраваннем паслядоўнасці этапаў працы з паперай, каляровая папера, кардон, нажніцы, аловак, клей.

Змест. Гутарка аб дызайне "Мастак-канструктар і яго дзейнасць". Настаўнік дэманструе дызайн-праекты, карткі-схемы з адлюстраваннем аперацый пры канструяванні прасцейшых цацак-самаробак, тлумачыць значэнне слоў **дызайн, праект, канструяванне, арыгамі.** На вырабы, якія выкананы ў тэхніцы арыгамі, звяртаецца асаблівая ўвага. Потым дзеці пад кіраўніцтвам настаўніка засвойваюць адзіную тэхналогію канструявання цацак і самастойна выкарыстоўваюць яе ў сваіх работах. Гэта могуць быць самалёцікі, караблікі, куфэрачкі розных відаў і г.д. Пры дастатковасці часу вырабы можна ўпрыгожыць дадатковымі дэталямі.



Пад час аналізу вырабаў вучні самі характарызуюць работы, апісваюць этапы працы, карыстаючыся спецыяльнымі тэрмінамі. Настаўнік падводзіць вынікі ўрока, выстаўляе адзнакі.

Заданне на дом: прадумаць праект вырабу з выкарыстаннем дызайну.

УРОК 9

Тэма: "Папера, клей (дызайн). Вырабы рознай формы". Канструяванне.

Мэта: удасканальваць практычныя навыкі мастацкага канструявання з выкарыстаннем матэрыялаў рознай формы; вучыць дапаўняць вырабы дадатковымі дэталямі, дэкарыраваць іх каляровай паперай; развіваць камбінаторыку, фантазію; выхоўваць цікавасць да дызайну як віду мастацтва.

Абсталяванне: рэпрадукцыі, слайды, мастацкія вырабы, матэрыялы для канструявання (флаконы, бляшаначкі, пушачкі, каробачкі рознай формы, кардон, белая і каляровая папера і г.д.), алоўкі, нажніцы, клей, памазок, узоры вучнёўскіх работ.

Змест. Наглядны матэрыял дазваляе дзецям засвоіць узоры бытавога, тэхнічнага, архітэктурнага дызайну. На прыкладзе ўзорных работ вучні зразумеюць, што з непатрэбных на першы погляд рэчаў можна зрабіць шмат цікавых і карысных вырабаў. Надаць ім эстэтычны выгляд дапамагае аплікацыя.

Варыянты магчымых вырабаў аб'яднаўваюцца калектыўна. Гэта могуць быць машынкі, хаткі, цацачная мэбля і інш. Настаўнік паказвае асноўныя аперацыі канструявання, паслядоўнасць іх выканання, і дзеці прыступаюць да практычнай дзейнасці. Яны дапамагаюць адзін аднаму, звяртаюцца за дапамогай да настаўніка. У канцы ўрока вырабы разглядваюцца, выяўляюцца недахопы, шляхі іх выпраўлення, абмяркоўваюцца элементы ўпрыгожання.

Заданне на дом: закончыць канструяванне вырабаў, дапаўняючы іх неабходнымі дэталямі і элементамі ўпрыгожання.

УРОК 10

Тэма: "Пластылін (прыёмы лепкі). Беларуская кераміка".

Мэта: пазнаёміць дзяцей з разнастайнасцю выкарыстання выразных сродкаў (форма, аб'ём, колер) і матэрыялаў (пластылін, гліна) у творчай кампазіцыі; узнавіць прыёмы лепкі (скачванне, сплюшчванне, раскачванне, выцягванне); вучыць бачыць і перадаваць у лепцы асаблівасці формы прадмета; выхоўваць цікавасць да народнага мастацтва.

Абсталяванне: кнігі Я.М. Сахуты "Беларуская народная кераміка" (Мн., 1987), "Фарбы роднай зямлі" (Мн., 1985), рэпрадукцыі з выявамі беларускай керамікі, керамічны посуд, гліна (пластылін), вада, цырата або дошчачка, стэкі.

Змест. На падставе рэпрадукцый, кніг, керамічных вырабаў (місак, збанкоў, гарлачоў, гладышоў) настаўнік знаёміць дзяцей з беларускай керамікай. Яны ўбачаць залежнасць матэрыялаў, формы, дэкору прадметаў ад іх прызначэння, даведаюцца, што для беларускай керамікі характэрны цёплыя, няяркія колеры: чырвона-карычневыя, цёмна-зялёныя, жоўтыя, карычневыя. Настаўнік паказвае варыянты лепкі посуду шляхам уціскання і выцягвання (міскі), шляхам кругавой налепкі (збанкі, гарлачы, гладышы), дзеці замацоўваюць іх у практычнай дзейнасці. Абмеркаваўшы і выбраўшы прадмет лепкі, вучні працуюць самастойна. Надаць прадметам нетрадыцыйную форму, упрыгожыць іх дапамагае настаўнік.

Аналіз работ праводзіцца шляхам параўнання выяў, элементаў упрыгожання; узнаўляюцца прыёмы і паслядоўнасць этапаў лепкі, спецыяльная лексіка.

Заданне на дом: падрыхтаваць наглядны матэрыял з выявамі беларускай народнай керамічнай цацкі.

УРОК 11

Тэма: "Пластылін (прыёмы лепкі). Лепка па матывах народнай глінянай цацкі".

Мэта: пазнаёміць вучняў з мастацтвам глінянай народнай цацкі (Дымкава, Івянец і інш.); развіваць цікавасць да народнай творчасці: фарміраваць пачуццё пластыкі, формы, дэкаратыўнасці; удасканальваць прыёмы лепкі з цэлага кавалка пластыліну (гліны).

Абсталяванне: рэпрадукцыі з выявамі керамічных народных цацак (дымкаўскай, філімонаўскай, івянецкай), беларускія народныя цацкі, пластылін (гліна), цырата (дошчачкі), стэкі.

Змест. Выкарыстоўваючы наглядны матэрыял, настаўнік знаёміць дзяцей з узорамі народнай глінянай цацкі, раскрывае тэхналогію вырабаў з гліны, звяртаючы ўвагу на асаблівасці формы, канструкцыі і дэкору выяў.

Змест задання, якое трэба выканаць самастойна абмяркоўваецца, калектыўна складаецца план работы, узнаўляюцца этапы і паслядоўнасць працы, прыёмы лепкі. Настаўнік тлумачыць, як надаць выяве выразную позу, пластычнасць,



арыгінальнасць, традыцыйны дэкор.

Крытэрыямі аналізу работ з'яўляюцца вобразнасць, пластычнасць, дэкор, падабенства вырабаў з узорам. Акрамя таго, вучні павінны раскрыць тэхналогію вырабу сваёй цацкі. Настаўнік удакладняе і дапаўняе паведамленні дзяцей, падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: падрыхтавацца да аплікацыі саломкай: запарыць салому кіпнем, разрэзаць на падоўжныя палоскі, разгладзіць прасам.

УРОК 12

Тэма: "Розныя матэрыялы (саломка)". Аплікацыя.

Мэта: пазнаёміць дзяцей з тэхналогіяй аплікацыі саломкай, вучыць аналізаваць і складаць кампазіцыю ўзора, прымяняючы сіметрыю, рытміку, чаргаванне элементаў; выхоўваць цікавасць да нацыянальных асаблівасцей беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Абсталяванне: вырабы з саломкі, рэпрадукцыі з выявамі, упрыгожанымі ўзорамі з саломкі, палоска кардону ці цвёрдай паперы памерам 3х23 цёмна-зялёнага , залёнага, сіняга, чырвонага, карычневага ці вішнёвага колеру, саломка, нажніцы, клей, пінцэт, алоўкі, папера.

Змест. Уступная гутарка знаёміць дзяцей з вырабамі з саломкі, дазваляе удакладніць формы элементаў, з якіх складаецца ўзор, кампазіцыю і размяшчэнне дэталей на плоскасці прадмета.

На падставе нагляднага матэрыялу вучні прыдумваюць варыянты ўзораў для сваіх работ, формы геаметрычных фігур, паслядоўнасць этапаў работы.

Пад кіраўніцтвам настаўніка праводзіцца падрыхтоўчая работа: з саломкі наразаюцца кружкі, ромбікі, палоскі, квадрацікі, алоўкам намячаецца эскіз узора, выкладваецца пробны варыянт кампазіцыі.

Заключны этап работы патрабуе ад дзяцей асаблівай увагі, засяроджанасці. Палоска кардону (аснова) намазваецца клеем, элементы ўзора акуратна выкладваюцца на яе паверхню пры дапамозе пінцэта. Гатовы малюнак добра прыціскаецца паперай ці тканінай. Рэшткі клею здымаюцца чыстай губкай.

У канцы ўрока праводзіцца выстава работ. Вучні робяць паведамленні аб стварэнні кампазіцыі, этапах работы. Настаўнік абагульняе і ўдакладняе паведамленні дзяцей, падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: падрыхтаваць прыродны матэрыял для аплікацыі ў тэхніцы фларыстыкі.

УРОК 13

Тэма: "Розныя матэрыялы (флора)". Аплікацыя.

Мэта: фарміраваць уменне творча выкарыстоўваць асабістыя назіранні і фантазію ў працэсе мастацка-практычнай дзейнасці; вучыць бачыць і перадаваць у аплікацыі формы і прапорцыі частак цела канкрэтных жывёл; развіваць пачуццё кампазіцыі, разумець значэнне паняццяў "цэнтр", "раўнавага", "рытм" пры яе састаўленні; выхоўваць добрасумленныя адносіны да выканання задання.

Абсталяванне: гербарый, слайды, узоры творчых кампазіцый, складзеных з элементаў раслін, прыродны матэрыял (элементы флоры), белая і каляровая папера, нажніцы, клей.

Змест. Гутарка на тэму "Фантазія прыроды" з выкарыстаннем слайдаў, гербарыя, у ходзе якой аналізуюцца форма, колер прыроднага матэрыялу, засвойваюцца паняцці "цэнтр", "раўнавага", "рытм".

У гульні "Ажыўшыя лісточкі" вучні пад кіраўніцтвам настаўніка вучацца складаць з прыроднага матэрыялу птушак, звяркоў, насякомых, надаючы неабходную форму дэталям шляхам іх абломвання ці абразання, узнаўляюць правілы размяшчэння элементаў аплікацыі на плоскасці ліста і прыёмы іх замацавання.

Над творамі на тэму "Лясное царства" дзеці працуюць самастойна. Пры абмеркаванні вырабаў замацоўваюцца паняцці тэрмінаў, вывучаныя на ўроку, адзначаюцца лепшыя работы вучняў.

Заданне на дом: прадумаць змест творчай работы па выбару, падрыхтаваць неабходныя матэрыялы для яе выканання.

УРОК 14

Тэма: "Творчая работа па выбару". Выяўленне, упрыгожванне, канструяванне.

Мэта: удасканальваць дзейнасць зрокавага ўспрымання дзяцей, развіваць фантазію, творчасць; вучыць самастойна выбіраць напрамак творчай дзейнасці і тэхніку яе выканання, планаваць працэс работы; выхоўваць настойлівасць, уменне выконваць работу якасна і своечасова.

Абсталяванне: рэпрадукцыі твораў выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва, дызайну, узоры вучнёўскіх работ, разнастайныя мастацкія матэрыялы і прылады.

Змест. Ва ўступнай гутарцы "Мастак – твор – глядач" настаўнік узнаўляе веды дзяцей аб трох відах мастацка-практычнай дзейнасці (выяўленні, канструяванні, дэкоры), аб асноўных тэхніках, з якімі пазнаёміліся на ўроках на працягу чвэрці. Пры неабходнасці паўтараюцца найбольш значныя прыёмы працы. Напрамак, від дзейнасці, тэхніку выканання і мастацкія матэрыялы для самастойнай работы вучні выбіраюць самі. Тэму, сюжэт, галоўных герояў ці мастацкі вобраз твора можна абмеркаваць з настаўнікам або таварышам.

Творчая работа пачынаецца з падрыхтоўкі эскізаў. Настаўнік робіць неабходныя папраўкі, дае парады. Далейшая работа па выкананню задання выконваецца вучнямі самастойна.

Заданне на дом: прадумаць кампазіцыю ўпрыгожвання твораў мастацкай дзейнасці, зробленых на ўроку.

УРОК 15

Тэма: "Творчая работа па выбару". Выяўленне, упрыгожванне, канструяванне.

Мэта: удасканальваць вобразнасць мыслення дзяцей, іх камбінаторыку, пачуццё дэкаратыўнасці і пластыкі ў працэсе самастойнай творчасці; развіваць навыкі работы з разнастайнымі мастацкімі матэрыяламі; замацоўваць унутраную пазіцыю "Я – мастак" маленькай асобы, дабівацца свабоды творчасці і ўпэўненасці ў сабе.

Абсталяванне: рэпрадукцыі, эскізы, эцюды, слайды па тэме "Выяўленне, упрыгожванне, канструяванне", работы вучняў мінулых гадоў, разнастайныя мастацкія матэрыялы і прылады.

Змест. Пад час гутаркі "Я – мастак" настаўнік стараецца захапіць вучняў працэсам вольнай творчасці, выклікаць узлет фантазіі. Потым дзеці расказваюць аб сваіх праектах упрыгожвання, якім павінна закончыцца работа, пачатая на мінулым уроку. Узнаўляюцца неабходныя прыёмы працы, абмяркоўваюцца метады афармлення работ для выставы, і вучні прыступаюць да самастойнай дзейнасці. При неабходнасці заканчваюць работу дома.

Заданне на дом: падрыхтаваць і аформіць работы для выставы, паўтарыць мастацкую тэрміналогію.

УРОК 16

Тэма: "Паўтарэнне і абагульненне пройдзенага матэрыялу за чвэрць". Гутарка.

Мэта: замацаваць асноўныя віды выяўленчага мастацтва, матэрыялы і мастацкія тэхнікі; узнавіць і абагульніць паняцці аб мастацкай тэрміналогіі; фарміраваць самастойнасць разважанняў аб выяўленчым мастацтве, уменне аналізаваць творы.

Абсталяванне: рэпрадукцыі з твораў выяўленчага мастацтва, мастацкія матэрыялы і прылады, работы вучняў.

Змест. У пачатку ўрока праводзіцца абмеркаванне выставы, якая афармляецца перад урокам. Дзеці расказваюць аб сваіх работах, настаўнік абагульняе паведамленні вучняў. Паўтараецца (з выкарыстаннем нагляднага матэрыялу) змест тэм, пройдзеных на працягу чвэрці, мастацкая тэрміналогія.

Завяршаецца ўрок віктарынай "У майстэрні мастака".

Заданне на дом. "Мой любімы мастак" – сачыненне з ілюстрацыямі або малюнак па выбару.

II ЧВЭРЦЬ

Сакрэты майстроў

У гэтай чвэрці дзеці атрымаюць канкрэтныя веды па трох відах мастацкай дзейнасці – выяўленню, упрыгожванню, канструяванню, засвояць асновы мастацтва і сакрэты майстэрства. Яны навучацца маляваць рознымі мастацкімі інструментамі (алоўкамі, фламастэрамі, крэйдай, пэндзлем), ляпіць рэльеф, разнастайныя прадметы, фігуру чалавека, праектаваць, канструяваць макеты розных вырабаў, упрыгожваць іх узорам і арнаментам.

Вучні даведаюцца, што прырода, прадметны свет, чалавек – гэта рэальнасць, першааснова ўсіх відаў мастацкай творчай дзейнасці. Гэта крыніца, з якой мастак чэрпае сюжэты і вобразы для сваіх твораў. Фантазія – гэта выдумка, мара, гэта здольнасць чалавека да творчасці на падставе рэальнага жыцця. Фантазія і творчасць заўсёды індывідуальныя і непаўторныя.

Настаўнік дапамагае другакласнікам убачыць спалучэнне розных відаў дзейнасці ў адным мастацкім творы, падабенства і адрозненне выразных сродкаў, вучыць працаваць самастойна, фарміруе ў іх слоўнік спецыяльных тэрмінаў.

Тэма праграмы:

"Сакрэты майстроў"

УРОК 1

Тэма: "Тры майстры (выяўленне, упрыгожванне, канструяванне)". Гутарка.

Мэта: пашыраць уяўленні вучняў аб трох відах мастацкай дзейнасці (выяўленні, упрыгожванні, канструяванні) і іх асаблівасцях; вучыць аналізаваць мастацкія творы, бачыць, як мастакі выкарыстоўваюць асабістыя назіранні і фантазію ў творчай дзейнасці; выхоўваць цікавасць да выяўленчага мастацтва.

Абсталяванне: творы жывапісу, дэкору і дызайну ў выкананні розных мастакоў, мастацкія матэрыялы і прылады працы.

Змест. Настаўнік знаёміць дзяцей з трыма майстрамі – выяўленнем, упрыгожваннем, канс-

труваннем (можна выкарыстаць гульнявые прыёмы з лялькамі). Кожны майстар расказвае аб сваім мастацтве, матэрыялах і інструментах працы, выкарыстоўваючы наглядны матэрыял. Дзеці не толькі атрымліваюць уяўленні аб відах мастацтва, але і вучацца аналізаваць мастацкія творы, назапашваюць слоўнік спецыяльных тэрмінаў.

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на цесную ўзаемасувязь трох відаў мастацка-практычнай дзейнасці, паказвае вырабы, у якіх гарманічна спалучаюцца элементы лепкі, малявання, канструявання

Замацоўваюцца атрыманыя веды пры дапамозе франтальнага апытання, аналізу твораў мастацкай дзейнасці дзецьмі.

Заданне на дом: падрыхтаваць апавяданне-аналіз твора аднаго з трох відаў мастацкай дзейнасці.



УРОК 2

Тэма: "Майстар выявы і яго сакрэты". Маляванне.

Мэта: даць уяўленне аб тым, што мастак можа адлюстроўваць у сваіх творах любыя з'явы і аб'екты рэальнага жыцця; вучыць дзяцей арганізоўваць працэс выяўленчай дзейнасці: выбіраць становішча ліста, вызначаць галоўныя этапы работы, размяшчаць выявы на плоскасці, замалёўваць фігуры, працаваць у колеры; развіваць уменне выкарыстоўваць у ходзе работы над кампазіцыяй асабістыя назіранні; выхоўваць пачуццё адказнасці за вынікі сваёй працы.

Абсталяванне: рэпрадукцыі твораў мастакоў з адлюстраваннем чалавека, разнастайных з'яў і аб'ектаў рэчаіснасці, малюнкі вучняў, узорныя малюнкі настаўніка, папера белага колеру, выяўленчыя прылады працы па выбару (алоўкі, фарбы, фламастэры).

Змест. З уступнай гутаркі дзеці даведваюцца, што крыніцай натхнення для мастака з'яўляецца навакольнае асяроддзе. Мноства форм прыроды, жывёльны свет і свет чалавека ён можа адлюстраваць і на плоскасці, і ў аб'ёме. Галоўнай жа тэмай мастацтва з'яўляецца чалавек, якога можна паказаць у творах па-рознаму: бюст, у поўны рост, статычна або ў руху.

Будова фігуры чалавека, прапорцыі частак цела вывучаюцца пры дапамозе аплікацыйнай выявы, якую настаўнік перамяшчае на шурпатай паверхні.

Дзеці выбіраюць для самастойнай дзейнасці адну з трох тэм: "Я спартсмен", "Я адказваю ля дошкі", "Мой сябар" (сяброўка)". Асноўныя этапы малявання настаўнік паказвае на дошцы, скіроўваючы ўвагу вучняў на перадачу ў малюнку канструкцыі і прапорцый частак фігуры.

Аналізуюць малюнкі самі дзеці, настаўнік удакладняе, дапаўняе выказванні вучняў, падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: закончыць малюнак, дапаўняючы яго сэнсавым фонам.

УРОК 3

Тэма: "Выяўленне і рэальнасць". Лепка.

Мэта: удасканальваць навыкі выяўленчай дзейнасці дзяцей, творчага выкарыстання асабістых назіранняў і фантазіі ў працэсе работы; вучыць бачыць і перадаваць у лепцы асаблівасці формы і прапорцый частак фігуры чалавека камбінаваным спосабам; развіваць уменне спалучаць у творчай кампазіцыі разнастайныя выразныя сродкі (аб'ём, пластыку, фактуру); выхоўваць акуратнасць.

Абсталяванне: лялькі "Беларусачка" і "Гаспадынька", ілюстрацыі з выявамі людзей у беларускіх нацыянальных касцюмах, пластылін (гліна), стэкі, штампы-пячаткі.

Змест. У ходзе ўступнай гутаркі дзеці знаёмяцца з тэхналогіяй лепкі фігуры чалавека, апранутай у нацыянальны беларускі касцюм. Замацоўваюцца асноўныя элементы адзення, узнаўляюцца і аналізуюцца розныя спосабы і прыёмы працы.

Настаўнік паказвае спосабы раскочвання пластыліну (гліны) рукамі, спосабы лепкі сукенкі канічнай формы, рукава, фартушка, галаўнога ўбору, звяртаючы ўвагу на паслядоўнасць этапаў лепкі. Дзеці паўтараюць дзеянні настаўніка, выбіраюць найбольш зручныя для сябе прыёмы працы.

Пад час самастойнай практычнай дзейнасці вучні лепяць лялек у нацыянальным адзенні або салдацікаў, дапаўняючы выявы рознымі дэталямі. Гэта можа быць буханка хлеба ў руках лялек ці зброя ў руках салдаціка.

Работы размяшчаюцца для аналізу на агульнай падстаўцы, дзеці калектыўна абмяркоўваюць вынікі працы.

Заданне на дом: падрыхтаваць наглядны матэрыял (кніжкі, паштоўкі, ілюстрацыі) з адлюстраваннем фантастычных выяў.

УРОК 4

Тэма: "Выяўленне і фантазія". Маляванне.

Мэта: даць уяўленні аб ролі фантазіі ў мастацтве аб сувязі рэальнасці і фантазіі ў творчасці мастака-жывапісца; развіваць пачуццё кампазіцыі і мастацкай выразнасці вобраза; вучыць выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці розныя мастацкія матэрыялы і тэхнікі; выхоўваць цікавасць да народнай творчасці.

Абсталяванне: рэпрадукцыі і ілюстрацыі з

выявамі фантастычных вобразаў, ілюстраваныя зборнікі казак, папера белага колеру, алоўкі, васковая крэйда, фарбы.

Змест. Дзеці разглядваюць ілюстрацыйны матэрыял з адлюстраваннем фантастычных вобразаў і казачных істот, зачытваюць урыўкі казак, супастаўляючы апісанне героя словам і фарбамі. У гульні "Да чаго падобны?" дзеці на падставе канкрэтных прадметаў ствараюць фантастычныя вобразы, апісваюць іх словамі. Па прапанове настаўніка яны прыдумваюць кампазіцыю , героем якой з'яўляецца фантастычная істота, робяць простым алоўкам эскіз малюнка, удакладняючы прыёмы малявання з настаўнікам. Для канчатковага завяршэння малюнка дзеці выкарыстоўваюць інструменты і матэрыялы па выбару.

Пры абмеркаванні работ увага звяртаецца на фантастычнасць і мастацкую выразнасць твора.

Заданне на дом: прыдумаць гісторыю ці фрагмент казкі да свайго малюнка.

УРОК 5

Тэма: "Выяўленне і фантазія". Лепка.

Мэта: удасканальваць прыёмы лепкі і навыкі выканання аб'емнай кампазіцыі, развіваць фантазію і вобразнасць мыслення; выхоўваць цікавасць да народнай фантазіі.

Абсталяванне: ілюстрацыі з выявамі лепкі, малюнкі педагога, пластылін (гліна), стэкі, цырата або дошчачкі.

Змест. Ва ўступнай частцы ўрока дзеці расказваюць казачныя гісторыі, якія яны падрыхтавалі дома. Наглядны матэрыял, выявы фантастычных казачных герояў (Чорціка, Страшыдлы, Змея Гарыныча, Пачвары і інш.) дапамогуць дзецям засвоіць паняцці "фантазія", "фантастычны вобраз", "казачны герой".

Настаўнік дэманструе асноўныя этапы лепкі казачных істот, прыёмы, пры дапамозе якіх можна дабіцца найбольш поўнага адлюстравання выразнасці позы і характару героя. Складаныя прыёмы працы замацоўваюцца ў практычнай дзейнасці.

Выбраўшы тэму лепкі, дзеці працуюць самастойна.

У канцы ўрока праводзіцца выстава фантастычных выяў, у абмеркаванні якой прымаюць удзел усе вучні, узгадваюцца словы-тэрміны: тэхналогія і этапы лепкі.

Заданне на дом: размаляваць зробленыя на ўроку выявы алоўкамі або шарыкавай ручкай.

УРОК 6

Тэма: "Майстар упрыгожвання і яго сакрэты. Узор і арнамент". Маляванне.

Мэта: пашыраць уяўленні дзяцей аб мастацтве ўпрыгожвання, яго мове і выразных сродках (функцыі, матэрыяле, форме, дэкоры); развіваць графічныя навыкі, уменне маляваць разнастайныя лініі, рабіць штрыхоўку; назапашваць слоўнік спецыяльных термінаў; выхоўваць мастацкае ўспрыманне свету.

Абсталяванне: рэпрадукцыі карцін, фотаздымкі і малюнкі з адлюстраваннем разнастайных арнаментаў, папера белага колеру, каляровыя алоўкі, фламастэры, туш, шарыкавая ручка.

Змест. Разглядваючы рэпрадукцыі карцін, фотаздымкі, дзеці атрымліваюць ўяўленне аб нерукатворным харастве чараўніцы-прыроды. Кветкі, лісточкі, кропелька расы, павуцінка і да т.п. з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай творчасці мастака. Прыгажосць і гармонія раслінных форм знаходзяць адлюстраванне ва ўпрыгожванні посуду, адзення і г.д.

Настаўнік дае дакладнае вызначэнне паняцця "арнамент" і яго відаў, звяртае ўвагу на рытмічнасць і чаргаванне элементаў арнаменту, гарманічнае спалучэнне формы і колераў.

Пасля абмеркавання магчымых варыянтаў узораў, выбару найбольш удалых колеравых спалучэнняў дзеці самастойна ствараюць раслінны арнамент.

У канцы ўрока работы аналізуюцца, настаўнік сочыць, каб вучні карысталіся мастацкай тэрміналогіяй.

Заданне на дом: намаляваць арнамент са сняжынак рознай формы.

УРОК 7

Тэма: "Упрыгожванне і рэальнасць" Дэкор.

Мэта: на падставе вывучэння разнастайнасці прыродных форм развіваць ў дзяцей пачуццё дэкаратыўнасці, уменне бачыць сувязь паміж выяўленнем і ўпрыгожваннем. Пры адлюстраванні складаных форм вучыць карыстацца дадатковымі дапаможнымі лініямі; удасканальваць разуменне каляровай гармоніі; выхоўваць мастацкі густ.

Абсталяванне: фотарэпрадукцыі, паштоўкі, узорныя малюнкі настаўніка з адлюстраваннем прадметаў, упрыгожаных матылькамі і кветкамі, папера белага колеру, гуаш, нажніцы, аловак, вялікі ліст тоўстай паперы.

Змест. Дзеці разглядваюць кветкі і матылькоў рознай формы і расфарбоўкі. Складаюць дэкаратыўную кампазіцію "Кветкі і матылькі". Настаўнік тлумачыць і паказвае прыёмы выканання выяў у тэхніцы манатыпіі. Ліст складваецца папалам, на адной палове якога малюецца палова каляровага сілуэта матылька або кветкі. Пры прыціскванні да чыстай паловы ліста сілуэт адбіваецца на ім, упрыгожваецца дадатковымі лініямі, плямамі і да т.п. Потым выява выразаецца.

Кампазіцыя "Кветкі і матылькі" выкладваецца на вялікім лісце паперы, аналізуецца. Вынікі ўрока падводзіць настаўнік.

Заданне на дом. Замаляваць узоры і арнаменты з прадметаў хатняга ўжытку.

УРОК 8

Тэма: "Упрыгожванне і фантазія". Дэкор.

Мэта: працягваць знаёмства дзяцей з тэхналогіяй упрыгожвання; вучыць творча выкарыстоўваць у аздабленні асабістыя назіранні і фантазію; развіваць уменне спалучаць у кампазіцыі ўзор і форму вырабу ; выхоўваць мастацкі густ і цікавасць да народнага дэкаратыўна–прыкладнога мастацтва.

Абсталяванне: фотарэпрадукцыі твораў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фотаздымкі ці ілюстрацыі з адлюстраваннем нацыянальных касцюмаў, малюнкі педагога, прадметы дэкору, алоўкі, гуаш.

Змест. На пачатку ўрока абмяркоўваецца выстава замалёвак, якія дзеці зрабілі дома. Настаўнік на падставе нагляднага матэрыялу тлумачыць, як выкарыстоўваюцца ва ўпрыгожванні прыродныя формы, перадаецца колер.

Для замацавання паняцця аб рытмічнасці і чаргаванні форм робяцца схематычныя замалёўкі рытмічных злучэнняў, да якіх падбіраецца адпаведны колер.

Пасля дапаможных практыкаванняў вучні атрымліваюць сілуэты прадметаў быту, адзення і самастойна ўпрыгожваюць іх.

Аналіз работ праводзіць настаўнік, ён адзначае поспехі дзяцей у авалодванні навыкамі ўпрыгожвання.

Заданне на дом. Зрабіць схематычныя замалёўкі прадметаў, якія можна выканаць сваімі рукамі.



УРОК 9

Тэма: "Майстар канструявання і яго сакрэты". Дызайн.

Мэта: даць уяўленне аб дызайне як асобым відзе мастацкай дзейнасці, яго асаблівасцях; вучыць дзяцей бачыць прыгажосць і гармонію прыродных канструкцый; развіваць здольнасці да пераўтварэння прыродных форм і рацыянальных канструкцый у праекты вырабаў, выхоўваць цікавасць да канструявання.

Абсталяванне: тэматычныя слайды, фотарэпрадукцыі біядызайну, малюнкі педагога, папера белага колеру, аловак, шарыкавая ручка.

Змест. Гутарка "Дызайн у прыродзе, прамысловасці і быце". Дзеці даведваюцца, што вытокі канструявання – у рэальным жыцці чалавека. Майстры канструявання – архітэктары – праектуюць розныя пабудовы, канструктар-інжынер стварае масты, дарогі, машыны; прадметы быту – мэбля, посуд, адзенне, цацкі – справа рук дызайнера.

Шмат рацыянальных і прыгожых канструкцый пад назвай "Біядызайн" стварае прырода (арэхі, грыбы, соты пчол, стручок, шышка і да т.п.). Біядызайн з'яўляецца пастаянным памочнікам мастака-канструктара.

Настаўнік тлумачыць і паказвае этапы праектавання розных вырабаў, і вучні пад кіраўніцтвам настаўніка робяць замалёўкі, накіды праектаў з выкарыстаннем біяканструктара, прыгожа афармляюць іх.

У канцы ўрока дзеці абараняюць свае дызайн-праекты.

Заданне на дом: скласці спіс арыгінальных канструкцый, зрабіць замалёўку адной з іх.

УРОК 10

Тэма: "Канструяванне і рэальнасць". Канструяванне.

Мэта: пашырыць уяўленні дзяцей аб разнастайнасці і заканамернасці канструкцый і форм, якія існуюць у рэальным жыцці; дапамагчы асвоіць тэхналогію і этапы дызайну; выхоўваць мастацкі густ, развіваць творчасць.

Абсталяванне: ілюстрацыі, слайды, работы вучняў з выявамі разнастайных вырабаў, белая і каляровая папера, аловак, нажніцы, клей.

Змест. Дзеці угадваюць і называюць простыя і зручныя канструкцыі (грыб – парасон, страказа – верталёт, жук – усюдыход, чарапаха – танк і г.д.). Настаўнік, выкарыстоўваючы наглядны матэрыял, нагадвае, што дызайн – гэта прастата, зручнасць, арыгінальнасць, прыгажосць і гармонія канструкцый па функцыі, форме, матэрыялу, колеру.

Вучні робяць эскізы праект-дызайнаў, а потым пачынаюць канструяваць вырабы. Настаўнік пры неабходнасці нагадвае прыемы працы з паперай (складванне, выразанне, склейванне), дае парады, як можна выкарыстаць аплікацыю, калаж для завяршэння работы.

Пад час аналізу асаблівая ўвага звяртаецца на спалучэнне канструкцыі і прыгажосці, зручнасці і

карыснасці вырабаў.

Заданне на дом: падрыхтаваць матэрыял для вырабу розных канструкцый.

УРОК 11

Тэма: "Канструяванне і фантазія". Канструяванне.

Мэта: вучыць дзяцей творча выкарыстоўваць асабістыя назіранні і фантазію ў працэсе канструявання, улічваць матэрыялы, функцыі і дэкор; развіваць у вучняў прасторавыя ўяўленні, уменне знаходзіць аб'ёмы; выхоўваць цікавасць да вырабу прадметаў сваімі рукамі.

Абсталяванне: фотарэпрадукцыі дызайн-праектаў, ілюстрацыі з адлюстраваннем вырабаў канструявання, розныя матэрыялы (каробкі, флаконы, падрыхтаваныя конусы, цыліндры, прызмы з каляровай паперы), белая і каляровая папера, нажніцы, клей, аловак.

Змест. На падставе нагляднага матэрыялу дзеці замацоўваюць веды аб архітэктурным, прамысловым, бытавым дызайне, мастаках-канструктарах і іх творах.

Перад вучнямі ставіцца задача: выкарыстоўваючы фантазію, кемлівасць, выдумку, стварыць дызайн-праект і рэалізаваць задуму пры дапамозе наяўных матэрыялаў.

Настаўнік дапамагае удакладніць кампазіцыю праекта, выбраць неабходныя матэрыялы і арыгінальнае тэхнічнае вырашэнне задачы, узнаўляе этапы праектавання, паказвае найбольш зручныя прыёмы працы.

У абмеркаванні работ прымаюць удзел усе дзеці, настаўнік падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: прадумаць сюжэт, мастацкія матэрыялы і тэхніку выканання работы на вольную тэму.

УРОКІ 12 – 13

Тэма: "Мой любімы майстар і яго творы (вольная тэма)".

Мэта: замацаваць веды аб трох відах мастацкай дзейнасці (выяўленні, упрыгожванні, канструяванні) і іх асаблівасцях; вучыць мастацка-практычнай дзейнасці на падставе "сакрэтаў" майстроў; развіваць цікавасць да сучаснага беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і ўменне выкарыстоўваць у сваіх творах яго асаблівасці; выхоўваць культуру мовы.

Абсталяванне: наглядны матэрыял аб трох відах мастацкай дзейнасці, работы вучняў.

Змест. Гутарка "Тры майстры і іх сакрэты", у ходзе якой узнаўляюцца звесткі, атрыманыя на працягу чвэрці, пра жывапіс, графіку, архітэктуру, дызайн, дэкор. Затым дзеці расказваюць аб сюжэтах твораў, якія яны будуць выконваць, матэрыялах і тэхніках выканання. Абмяркоўваюцца найбольш складаныя прыёмы працы, удакладняецца кампазіцыя, форма,колер і да т.п.

Другі ўрок адводзіцца для самастойнай практычнай дзейнасці дзяцей.

Пад час аналізу вучні робяць кароткія паведамленні аб сваіх работах.

Заданне на дом: скласці паведамленне-сачыненне "Мой любімы майстар і яго работа".

УРОК 14

Тэма: "Паўтарэнне і абагульненне пройдзенага за чвэрць". Гутарка.

Мэта: дапамагчы дзецям зразумець і адчуць эмацыянальную сувязь паміж іх асабістай дзейнасцю і творчасцю майстроў у галіне выяўлення, упрыгожвання, канструявання; паўтарыць звесткі аб трох відах мастацка-практычнай дзейнасці; развіваць навыкі аналізу твораў мастацтва; выхоўваць культуру мовы, уменне карыстацца спецыяльнай терміналогіяй.

Абсталяванне: творы мастакоў трох відаў мастацкай дзейнасці, лепшыя работы вучняў за чвэрць па маляванню, лепцы, канструяванню.

Змест. Гульня "Тры майстры", пад час якой паўтараюцца звесткі аб мастацкіх матэрыялах і тэхніках трох відаў мастацтва, узнаўляецца слоўнік спецыяльных тэрмінаў. Затым вучні аналізуюць розныя творы мастацка-практычнай дзейнасці, раскрываючы іх сюжэт, кампазіцыю, называюць матэрыялы і тэхнікі выканання, каляровую гаму твора.

У канцы ўрока праводзіцца віктарына. Дзеці вызначаюць тэхніку работ, якія ім паказвае настаўнік (аплікацыя, калаж, графіка, роспіс і да т.п.), называюць разнастайныя канструкцыі біядызайну, адказваюць на пытанні тыпу: хто ўзяў фарбы, пэндзлі, палітру і намаляваў букет кветак? Хто вылепіў герояў да казкі "Рэпка"? Хто распісаў маме кухонную дошку пеўнямі?

Заданне на дом: скласці апавяданне "Навагодні сон" і намаляваць да яго малюнкі.

III ЧВЭРЦЬ

Аб чым гаворыць мастацтва?

Фарміраваць здольнасці эстэтычнага ўспрымання, ацэначных адносін да рэчаіснасці і мастацкага вобраза, развіваць эмацыянальную спагадлівасць да настрою замалёвак і творчую актыўнасць дзяцей – асноўная задача выяўленчага мастацтва ў другім класе.

Мастацкі вобраз – ядро, сутнасць вялікага і шматлікага мастацтва, у якім аўтар адлюстроўвае свае адносіны да рэчаіснасці, свой унутраны свет, сваё "Я".

Настаўнік дапаможа вучням бачыць творы мастацтва не толькі вачыма, але адчуваць іх сэрцам, душой, ствараць асабістыя мастацкія вобразы на падставе назіранняў, літаратуры, музыкі і іншых відаў мастацтва.

Ад урока к уроку практычная дзейнасць дзяцей будзе набліжаць іх да стварэння свайго, непаўторнага мастацкага вобраза, адзінага па форме і зместу, задумах і адчуваннях у выяўленні, упрыгожванні, канструяванні.

УРОК 1

Тэма: "Вобраз у мастацтве". Гутарка і выяўленне. Маляванне.

Мэта: даць уяўленне аб мастацкіх вобразах прыроды, жывёл, чалавека ў выяўленні, упрыгожванні, канструяванні; развіваць фантазію і творчасць дзяцей у практычнай дзейнасці; выхоўваць здольнасць да эмацыянальнага ўспрымання свету мастацтва.

Абсталяванне: рэпрадукцыі твораў выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва, дызайну і архітэктуры, фотаздымкі, работы дзяцей па тэме, ілюстрацыі да кнігі "Прыгоды Бураціна" А. Талстога, магнітафонны запіс музычных твораў разнастайнай эмацыянальнай афарбоўкі, каляровыя алоўкі, фламастэры, папера белага колеру.

Змест. У ходзе гутаркі дзеці атрымліваюць уяўленне аб мастацтве як свеце мастацкіх вобразаў, якія адлюстроўваюць думкі і пачуцці чалавека, яго адносіны да рэчаіснасці. Кожны вобраз у творчасці мастакоў індывідуальны і непаўторны. З разнастайнасцю мастацкіх вобразаў чалавека, жывёл, прыроды вучні знаёмяцца пры дапамозе нагляднага матэрыялу. У гульні "Выява і вобраз" другакласнікі рэалізуюць атрыманыя тэарэтычныя веды: раскрываюць вобраз прапанаванага ім твора або мысленна ствараюць вобразную замалёўку, а потым пераносяць яе на ліст паперы. Настаўнік дапамагае вызначыць памеры, дэталі малюнка, форму, каляровую гаму.

Пад час аналізу дзеці характарызуюць свае работы, раскрываюць змест мастацкага вобраза.

Заданне на дом: зрабіць замалёўку любімага мастацкага вобраза, падрыхтаваць па ёй паведамленне.

УРОК 2

Тэма: "Вобразы прыроды". Маляванне.

Мэта: даць уяўленне аб тым, што праз адлюстраванне разнастайнага стану прыроды мастак выказвае свае пачуцці, настрой, адносіны да жыцця; развіваць навыкі выкарыстання колеру, тону, кампазіцыі для перадачы эмацыянальнага стану прыроды (спакойнага, ціхага); выхоўваць пачуццё спагадлівасці да прыгажосці прыроды, здольнасць бачыць і адчуваць розны стан прыроды ў рэальным жыцці і ў творах мастацтва.

Абсталяванне: рэпрадукцыі з карцін І.Левітана "Сакавік", І. Шышкіна "Жыта", А. Куінджы "Ноч над Дняпром", "Бярозавы гай", В. Бялыніцкага-Бірулі "Зялёны май" і інш., запісы музычных твораў спакойнага характару, каляровы круг, папера белага колеру, алоўкі, вялікія пэндзлі, гуаш.

Змест. Дзеці дэманструюць замалёўкі, якія яны падрыхтавалі дома, робяць невялікія паведамленні, настаўнік ацэньвае малюнкі і абагульняе адказы вучняў.

У ходзе гутаркі аб вобразах прыроды на падставе нагляднага матэрыялу абмяркоўваюцца кантрастныя з'явы прыроды, змяненне яе стану ў залежнасці ад сонца, ветру, дажджу.

У практыкаванні "Гама настрою" на асобных лістах выпрацоўваецца ўменне падбіраць колеры і іх адценні для перадачы спакойнага стану прыроды.

Настаўнік прапануе дзецям намаляваць пейзаж (поле, лес, мора і г.д.), які б адлюстроўваў спакойны стан прыроды, нагадвае прыёмы малявання, вызначэння лініі гарызонта, правілы афармлення адносін "зямля – неба", пярэдняга і далёкага планаў малюнка.

Пейзажныя замалёўкі дзяцей афармляюцца ў выглядзе выставы, 2–3 работы аналізуюцца падрабязна.

Заданне на дом: падабраць ілюстрацыйны матэрыял з адлюстраваннем неспакойнага стану прыроды.

УРОК 3

Тэма: "Вобразы прыроды". Маляванне.

Мэта: пашыраць уяўленні дзяцей аб мастацкіх вобразах і іх разнастайнасці; замацоўваць уменні карыстацца колерамі і іх адценнямі для перадачы эмацыянальнага стану прыроды (неспакойнага, бурнага, трывожнага); выхоўваць эстэтычнае ўспрыманне з'яў прыроды.

Абсталяванне: рэпрадукцыі з карцін І. Айвазоўскага "Дзевяты вал", К. Каро "Парыў ветру", М. Рэрыха "Нябесны бой" і інш., запісы музычных твораў, каляровая табліца, папера белага колеру, пэндзлі розных памераў, гуаш.

Змест. На падставе класных і дамашніх работ дзеці замацоўваюць уяўленні аб тым, што мастак у сваіх творах адлюстроўвае сваё ўспрыманне жыцця, адносіны да яго, настрой. Кожнаму гледачу зразумелы пачуцці аўтара, эмацыянальны фон карціны ўздзейнічае на эмацыянальны стан чалавека.

Пры дапамозе нагляднага матэрыялу і каляровай табліцы вучні знаёмяцца з разнастайнымі каляровымі спалучэннямі для адлюстравання неспакойнага стану прыроды, якія ўжываюць мастакі. Настаўнік падрабязна аналізуе карціну І. Айвазоўскага "Дзевяты вал", расказвае пра мастака.

У практыкаванні "Гама настрою" вучні змешваюць фарбы, падбіраюць неабходныя для паказу неспакойнага стану прыроды колеры. Кампазіцыю бурнага, трывожнага пейзажу яны складаюць самі. У выпадку неабходнасці настаўнік дапамагае індывідуальна парадай або практычна.

У канцы ўрока робіцца параўнальны аналіз пейзажных малюнкаў з адлюстраваннем рознага стану прыроды, паўтараюцца звесткі аб выразных мастацкіх сродках.

Заданне на дом: зрабіць замалёўку-фантазію пейзажу ў непагоду.

УРОК 4

Тэма "Вобразы жывёл". Лепка.

Мэта: вучыць дзяцей выказваць свае адносіны да прадстаўнікоў жывёльнага свету праз выяўленне ў лепцы; замацоўваць навыкі работы пластыч-

нымі матэрыяламі; перадаваць у лепцы характар, позу, паводзіны жывёлы, яе настрой; выхоўваць добразычлівыя адносіны да жывёльнага свету.

Абсталяванне: рэпрадукцыі скульптур мастакоў-аніміалістаў І. Яфімава "Лань",В. Ватагіна "Малпа", цацкі, ілюстрацыі да дзіцячых кніжак Р. Кіплінг "Мауглі", І. Крылоў "Байкі", запісы музычных твораў, пластылін (гліна), стэкі.

Змест. Урок пачынаецца з абмеркавання вучнёўскіх замалёвак і пераходзіць у гутарку аб разнастайнасці жывёльнага свету з выкарыстаннем нагляднага матэрыялу, загадак, вершаў.

Кожная жывёла мае свае адметныя якасці, адрозніваецца знешнім выглядам, характарам, паводзінамі. Дзеці узгадваюць вобразныя характарыстыкі звяроў, птушак (хітрая ліса, упарты асёл, смяшлівая малпа, сарока-балбатуха і інш.), самастойна выбіраюць аб'ект для лепкі. Настаўнік паказвае спосабы і паслядоўнасць этапаў работы. Прыёмы выцягвання, раскочвання, прышчыпвання замацоўваюцца ў практыкаванні "пластычная гімнастыка".

У ходзе самастойнай дзейнасці вучняў асаблівая ўвага звяртаецца на выразнасць і характар жывёлы, адлюстраванне адносін аўтара да мастацкага вобраза.

У канцы ўрока работы аналізуюцца, дзеці робяць кароткія паведамленні па выніках аналізу, карыстаючыся мастацкай тэрміналогіяй.

Заданне на дом: падабраць вершы, загадкі да ілюстрацый з выявамі разнастайных прадстаўнікоў жывёльнага свету.

УРОК 5

Тэма: "Вобразы жывёл". Маляванне.

Мэта: вучыць выказваць свае адносіны да жывёл праз выяўленне ў мастацкім вобразе іх характару, паводзін, настрою; развіваць навыкі работы графічнымі матэрыяламі і інструментамі; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёльнага свету.

Абсталяванне: рэпрадукцыі з карцін мастакоў-аніміалістаў Я. Чарушына, В. Ватагіна, В. Васняцова, ілюстрацыі да кніжак пра жывёл, папера белага колеру, алоўкі, шарыкавая ручка, фламастэры, туш.

Змест. Гутарка "Вобразы жывёл у казках і рэальным жыцці" з выкарыстаннем нагляднага матэрыялу, вершаў, загадак, якія падрыхтавалі дзеці. Гутарка дапаможа дзецям атрымаць дакладнае ўяўленне аб стварэнні мастацкага вобраза жывёл, магчымасці выказаць да іх свае адносіны не толькі пры дапамозе матэрыялу, але і такімі мастацкімі сродкамі, як штрых, лінія, пляма, сілуэт.

Настаўнік нагадвае асноўныя спосабы і паслядоўнасць малявання жывёл алоўкам, тушшу. Прыёмы малявання, якія дапамагаюць адлюстраваць характар жывёлы, яе эмацыянальны стан, вучні замацоўваюць у дапаможных практыкаваннях. Аналізуе работы і падводзіць вынікі па тэме "Вобразы жывёл у мастацтве" настаўнік.

Заданне на дом: зрабіць замалёўку фантастычнай жывёлы.

УРОК 6

Тэма: "Чалавек. Станоўчы вобраз жанчыны". Маляванне.

Мэта: даць уяўленне аб адлюстраванні чалавека ў мастацтве як сродку выказвання сваіх адносін да свету; фарміраваць уменне ствараць станоўчы вобраз жанчыны; выхоўваць пачуццё захаплення жаноцкай прыгажосцю, дабрынёй, спагадлівасцю.

Абсталяванне: ілюстрацыі з выявамі жанчын на іконах, рэпрадукцыі з карцін В. Сярова " Дзяўчынка з персікамі", "Дзяўчынка, асвечаная сонцам", М. Урубеля "Царэўна-Лебедзь", дыяфільмы "Казка пра цара Салтана", "Папялушка", папера белага колеру, гуаш.

Змест. Настаўнік ацэньвае замалёўкі, якія дзеці зрабілі дома, правярае засваенне тэарэтычнага матэрыялу аб мастацкіх вобразах прыроды і жывёльнага свету.

Ва ўступнай гутарцы да новай тэмы раскрываецца вобраз жанчыны, у якім спалучаюцца знешні выгляд і яе ўнутраны свет. Дзеці разглядваюць ілюстрацыі з выявамі жанчын на іконах, рэпрадукцыях з карцін, знаёмяцца з гераінямі казак па дыяфільмах. Настаўнік дапамагае ім зразумець працэс тварэння мастацкага вобраза жанчыны праз кампазіцыю, форму, колер, сэнсавы фон.

Абмеркаваўшы гаму колераў для адлюстравання станоўчага мастацкага вобраза жанчыны, вучні пад кіраўніцтвам настаўніка робяць эскіз малюнка. Заканчваюць партрэты ў колеры дзеці самастойна.

У канцы ўрока робіцца выстава малюнкаў-партрэтаў "Добрая прыгажосць чалавека" з далейшым абмеркаваннем работ.

Заданне на дом: падрыхтаваць ілюстрацыйны матэрыял з выявамі вобразаў адмоўных жанчын.

УРОК 7

Тэма: "Чалавек. Адмоўны вобраз жанчыны". Маляванне.

Мэта: пашыраць уяўленні дзяцей аб разнастайнасці мастацкіх вобразаў чалавека ў залежнасці ад светаадчування мастака; вучыць перадаваць адмоўныя адносіны да чалавека праз яго адлюстраванне; развіваць навыкі, пачуццё каляровай гармоніі; выхоўваць цікавасць да чалавека як асобы.

Абсталяванне: ілюстрацыі да зборнікаў казак, узорны малюнак настаўніка, запісы музычных твораў, папера белага колеру, аловак, фарбы.

Змест. Дзеці робяць паведамленні да ілюстрацый з выявамі адмоўных вобразаў жанчын, якія яны падабралі. Робіцца вывад: прыгажосць чалавека псуе злоснасць, лянота, зайздрасць, прагнасць. Настаўнік звяртае ўвагу на разнастайныя дэталі знешняга выгляду злоснага чалавека (пакрыўлены твар, неахайнасць адзення і да т.п.).

Спосабы і паслядоўнасць малявання фігуры жанчыны, прыёмы атрымання "злосных" колераў для адлюстравання адмоўнага вобраза абмяркоўваюцца і удакладняюцца калектыўна.

Абдумаўшы змест малюнка, дзеці самастойна ствараюць мастацкі вобраз злой казачнай гераіні

(ведзьмы, Баба Ягі і інш.).

Урок заканчваецца параўнальным аналізам работ з адлюстраваннем станоўчых і адмоўных жаночых вобразаў.

Заданне на дом: падрыхтаваць ілюстрацыйны матэрыял і паведамленне да тэмы: "Станоўчы вобраз мужчыны".

УРОК 8

Тэма: "Чалавек. Станоўчы вобраз мужчыны". Маляванне.

Мэта: вучыць дзяцей маляваць вобраз мужчыны станоўчых якасцей; развіваць уменне перадаваць у малюнку свой настрой, адносіны да выявы; удасканальваць навыкі валодання фарбамі, алоўкамі; выхоўваць павагу да чалавека добрага, мужнага, смелага.

Абсталяванне: рэпрадукцыі карцін майстроў-партрэтыстаў А. Рублёва на біблейскія сюжэты, В. Васняцова "Тры волаты" і інш., ілюстрацыі да казак, запісы ўрыўкаў з оперы М. Глінкі "Іван Сусанін", М. Рымскага-Корсакава "Садко", папера белага колеру, алоўкі, фарбы.

Змест. Уступная гутарка на падставе наглядзнага матэрыялу аб чалавеку, станоўчых і адмоўных рысах яго характару, спосабах вобразнага адлюстравання іх у партрэце. Галоўная ўвага канцэнтруецца на выяўленні прыгажосці станоўчага вобраза чалавека (іканапісных партрэтаў, былінных герояў і герояў казак).

Настаўнік малюе на дошцы схему партрэта, дапаўняе его дэталямі, якія надаюць яму выразнасць і вобразнасць.

Над партрэтамі мужных, высакародных герояў (Садко, Несцерка, Іван-царэвіч, волат і г.д.) вучні працуюць самастойна.

Пры абмеркаванні работ адзначаюцца ўменне вобразна і выразна перадаць станоўчы характар героя.

Заданне на дом: дапоўніць малюнкі сэнсавым фонам.

УРОК 9

Тэма: "Чалавек. Адмоўны вобраз мужчыны". Маляванне.

Мэта: удасканальваць навыкі працы над партрэтам чалавека; вучыць ствараць адмоўны мастацкі вобраз чалавека пры дапамозе разнастайных мастацкіх сродкаў; выхоўваць пачуцці дабрыні, спагадлівасці, чуласці да людзей.

Абсталяванне: наглядны матэрыял з адлюстраваннем адмоўных вобразаў, узорны малюнак настаўніка, папера белага колеру, крэйда, алоўкі, фарбы.

Змест. Упачатку адзначаецца лепшы сэнсавы фон для партрэта станоўчага героя. Ва ўступнай гутарцы аналізуюцца вобразы адмоўных казачных герояў, абмяркоўваюцца спосабы адлюстравання злоснага (прагнага, баязлівага, хітрага) чалавека.

Настаўнік пры дапамозе схемы нагадвае прыёмы малявання, правілы змешвання фарбаў для атрымання "злосных" колераў, а потым дапамагае вучням зрабіць эскіз героя, якога яны будуць маляваць.

У канцы ўрока праводзіцца параўнальны аналіз станоўчых і адмоўных мужчынскіх вобразаў, замацоўваюцца веды аб мастацкіх сродках іх выяўлення.

Заданне на дом: зрабіць замалёўку мастацкага вобраза фантастычнага героя.

УРОК 10

Тэма: "Чалавек, пластыка. Вобраз ў аб'ёме". Лепка.

Мэта: вучыць дзяцей выказваць свае адносіны да мастацкага вобраза праз яго адлюстраванне ў аб'ёме; развіваць навыкі перадачы ў лепцы прапорцый частак цела чалавека; выхоўваць пачуццё захаплення стойкасцю, мужнасцю, вернасцю людзей свайму абавязку.

Абсталяванне: разнастайныя рэпрадукцыі з карцін, ілюстрацыі і слайды, на якіх адлюстраваны скульптурныя вобразы нацыянальных герояў, пластылін (гліна), стэкі.

Змест. Ва ўступнай гутарцы ўзгадваюцца адрозненні скульптуры ад выяўлення, жывапісу і графікі,праводзіцца параўнальны аналіз малюнка і скульптуры, іх мастацкіх сродкаў. Дзеці ўзнаўляюць звесткі аб выразных сродках мастака-скульптара (поза, жэсты, прапорцыі частак цела, рух або статычнасць). Наглядны матэрыял знаёміць вучняў з нацыянальнымі героямі нашай краіны, дапамагае асэнсаваць паняцці "вернасць" і "здрада", "мужнасць" і "баязлівасць".

Настаўнік паказвае прыёмы лепкі: з вялікага кавалку пластыліну шляхам выцягвання робіцца аснова фігуры чалавека. Змяняючы форму, прапорцыі частак цела, дынаміку жэстаў, можна надаць ёй неабходны мастацкі вобраз.

Найбольш складаныя прыёмы лепкі дзеці замацоўваюць у дапаможных практыкаваннях і прыступаюць да самастойнага стварэння мастацкага вобраза нацыянальнага героя ў аб'ёме.

Настаўнік аналізуе работы вучняў, звяртае ўвагу на мастацкія матэрыялы і сродкі выразнасці мастака-скульптара, падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: падрыхтаваць наглядны матэрыял да лепкі фігуры жанчыны.

УРОК 11

Тэма: "Чалавек, пластыка. Станоўчы вобраз жанчыны ў аб'ёме". Лепка.

Мэта: Працягваць знаёмства з вобразамі жанчын у мастацтве; удасканальваць навыкі адлюстравання чалавека ў аб'ёме, уменне выказаць свае думкі і пачуцці ў скульптуры; фарміраваць уяўленні аб сапраўднай прыгажосці асобы чалавека.

Абсталяванне: ілюстрацыйны матэрыял з выявамі жанчын у нацыянальным адзенні, лялькі "Прыгажуня", "Беларусачка", пластылін (гліна), стэкі.

Змест. Пры дапамозе наглядзнага матэрыялу дзеці знаёмяцца з разнастайнасцю жаночых вобразаў у скульптуры, узнаўляюць выразныя сродкі аб'ёмнага мастацтва (форма, жэсты, прапорцыі, дынаміка, пластыка і інш.). Асаблівая ўвага нада-

ецца вобразу беларускай гераіні, яе характару, адзенню, настрою.

Настаўнік дэманструе спосабы лепкі фігуры жанчыны з конусападобнай асновай, паказвае прыёмы, якія дапамагаюць зразумець адносіны аўтара да мастацкага вобраза.

Прадумаўшы кампазіцыю работ, вучні працуюць самастойна.

Выстава "Конкурс прыгажунь" і яе абмеркаванне завяршаюць урок.

Заданне на дом: скласці невялічкае апавяданне на тэму "Рэчы людзей".

УРОК 12

Тэма: "Рэчы людзей. Упрыгожванне і мастацкі вобраз". Лепка.

Мэта: даць уяўленне аб выказванні пачуццяў і думак чалавека, яго адносін да свету праз упрыгожванне прадметаў хатняга ўжытку; фарміраваць элементарныя навыкі складання ўзору (стылізацыя формы, простых рытмаў); працягваць знаёмства з нацыянальным народным мастацтвам, яго асаблівасцямі.

Абсталяванне: ілюстрацыі да энцыклапедыі "Этнаграфія Беларусі" (Мн., 1989), керамічныя вырабы (посуд), пластылін (гліна), стэкі.

Змест. Гутарка аб прыгажосці прадметаў хатняга ўжытку і народных умельцах. Дзеці знаёмяцца з прадметамі быту розных часоў і народаў, разнастайнасцю іх форм і ўпрыгожанняў. Падрабязна аналізуюцца асаблівасці беларускіх нацыянальных вырабаў. У выніку вучні атрымліваюць уяўленні аб залежнасці формы посуду ад яго прымянення, бычаць падабенства і адрозненне посуду па форме, характару, колеру і роспісу.

Для простай і зручнай у карыстанні беларускай керамікі ўласцівы няяркія, чырвона-карычневыя, цёмна-зялёныя і жоўтыя колеры. Характэрным узорам роспісу з'яўляюцца хвалістыя паяскі з невялічкімі дадатковымі элементамі (фляндроўка).

Настаўнік паказвае асноўныя прыёмы лепкі посуду: міска, сподачак, напрыклад, лепяцца з кавалка пластыліну, якому надаецца форма круглай аладкі; гаршчочак і кубак выцягваецца з кавалка пластыліну круглай формы.

Дзеці самастойна працуюць над вырабам посуду, а потым упрыгожваюць яго.

Настаўнік паказвае ўзор аналізу вырабаў і падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: зрабіць замалёўкі ўзораў з прадметаў хатняга ўжытку.

УРОК 13

Тэма: "Упрыгожванне і мастацкі вобраз". Маляванне.

Мэта: даць уяўленне аб асаблівасцях беларускага нацыянальнага касцюма; удасканальваць навыкі перадачы ва ўзоры сваіх думак, пачуццяў праз арнамент, форму элементаў, рытмічнасць кампазіцыі; выхоўваць цікавасць да нацыянальнай культуры.

Абсталяванне: фотарэпрадукцыі з выявамі прадметаў быту, упрыгожаных у стылі народных арнаментаў, ілюстрацыі з адлюстраваннем беларускіх нацыянальных касцюмаў, узорныя малюнкі настаўніка, папера белага колеру, фламастэры, гуаш.

Змест. Гутарка "Вобраз народнага касцюма", у ходзе якой дзеці знаёмяцца з прадметамі быту ў выкананні народных майстроў, матэрыяламі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (дрэвам, тканінай, глінай і г.д.). Настаўнік расказвае аб тым, што кожны народ мае сваё, адметнае ад іншых нацыянальнае адзенне, від упрыгожанняў, характар якіх вызначаецца прыроднымі ўмовамі жыцця, культурнымі традыцыямі грамадства.

Беларускае нацыянальнае адзенне шылі з адбеленага льнянога палатна. Дэталі адзення ўпрыгожвалі арнаментам чырвонага, чорнага або зялёнага колеру. Ромбападобны чырвоны арнамент на рукавах і грудзях жаночых сарочак звязаны з верай ў магічную сілу: ён нібы засцерагаў жанчын ад злосных духаў.

Замацоўваюцца назвы дэталей беларускіх нацыянальных касцюмаў (камізэлька, кашуля, сарочка, намітка, андарак, фартух, летнік, спадніца, каптур) пры выкананні эскізаў узораў і арнаментаў. Мастацкі вобраз чалавека ў беларускім нацыянальным касцюме вучні ствараюць самастойна.

Настаўнік аналізуе работы, дае парады па выпраўленню недакладнасцей у малюнку.

Заданне на дом: закончыць работу па стварэнню мастацкага вобраза чалавека ў беларускім нацыянальным адзенні.

УРОК 14

Тэма: "Характар упрыгожання". Маляванне.

Мэта: вучыць дзяцей перадаваць характар упрыгожання (вясёлы, сумны, урачысты і да т.п.); развіваць уменне правільна складаць узоры і арнамент, выкарыстоўваючы рытмічнасць чаргаванняў і паўторы элементаў; удасканальваць прыёмы працы фарбамі; выхоўваць самастойнасць у практычнай дзейнасці.

Абсталяванне: узоры разнастайных арнаментаў, ілюстрацыі, фотаздымкі ўзораў, малюнкі настаўніка, папера белага колеру рознай формы, аловак, фламастэры, гуаш.

Змест. На падставе наглядзнага матэрыялу дзеці знаёмяцца з разнастайнасцю ўзораў і арнаментаў. Асаблівая ўвага надаецца колькаснай абмежаванасці каляровай гамы, спалучэнню колераў, паўторам элементаў узору ў сярэдзіне і па вуглах малюнка, праз якія мастак выказвае свой характар, адносіны да свету.

Вучні выбіраюць неабходныя для работы лісты паперы, пад кіраўніцтвам настаўніка робяць эскізы арнаментаў для хусткі, ручніка, дыванка і г.д.

У канцы ўрока работы аналізуюцца дзецьмі. Настаўнік удакладняе прыёмы аналізу, падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: прыдумаць і зрабіць замалёўку арнаменту.

УРОКІ 15 – 16

Тэма: "Вобразы дызайну". Канструяванне.

Мэта: пазнаёміць дзяцей з вобразамі ў мастацкім канструяванні; удасканальваць навыкі працы ў галіне папяровай пластыкі – арыгамі; вучыць з дапамогай форм перадаваць кантрастныя пачуцці; развіваць творчае ўяўленне, уменне распазнаваць у творах мастацтва і ствараць самім кантрастныя па эмацыянальнаму ўспрыманню формы вырабаў у нацыянальным стылі, карыстаючыся рознымі па характару лініямі і формамі; выхоўваць цікавасць да творчай працы.

Абсталяванне: разнастайныя ўзоры, фотаздымкі і ілюстрацыі з выявамі мэблі, пасуды, цацкі, кардон, папера, нажніцы, клей.

Змест. Пад час уступнай гутаркі дзеці даведаюцца, што ў канструяванні адлюстроўваецца характар чалавека, яго намеры, мэты і настрой. Яны разглядваюць ілюстрацыі з выявамі мэблі і посуду розных часоў, знаёмяцца з матэрыяламі вырабаў, элементамі дэкору.

Пасля гутаркі вучні робяць эскізы, дызайн-праекты магчымых вырабаў, якія абмяркоўваюцца і удакладняюцца разам з настаўнікам.

Наступны ўрок пачынаецца з узнаўлення ведаў тэхнікі выканання вырабаў. Найбольш складаныя прыёмы работы з паперай, аплікацыі, калажу настаўнік паказвае сам, потым дзеці па сваіх эскізах самастойна вырабляюць посуд, мэблю і ўпрыгожваюць іх.

Пад час аналізу вучні робяць паведамленні аб тэхналогіі працэсу вырабу. Настаўнік абагульняе паведамленні дзяцей, падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: прыдумаць і зрабіць замалёўку дызайн-праекта.

УРОК 17

Тэма: "Вобразы архітэктуры" Канструяванне.

Мэта: фарміраваць эстэтычнае ўспрыманне архітэктурных вобразаў, удасканальваць навыкі канструявання з паперы і іншых матэрыялаў; выхоўваць цікавасць і павагу да нацыянальнай спадчыны ў архітэктуры.

Абсталяванне: ілюстрацыйны матэрыял з узорамі сусветнай і беларускай архітэктуры, эскізы і праекты ў выкананні архітэктараў, папера, кардон, каробкі розных памераў і іншыя матэрыялы, клей.

Змест. Настаўнік пры дапамозе нагляднага матэрыялу раскрывае адзінства формы, колеру, матэрыялу і вобраза ў архітэктуры, яе цесную сувязь з чалавекам, яго адносінамі да жыцця. Разглядваюцца і абмяркоўваюцца варыянты праектаў, матэрыялаў для іх выканання.

Дзеці спачатку працуюць над эскізамі праектаў дома (палаца або вежы), а потым займаюцца канструяваннем архітэктурных вырабаў.

Работы афармляюцца ў выглядзе горада для лялек, дзеці прыдумваюць казку або гісторыю з жыцця. Настаўнік падводзіць вынікі ўрока.

УРОКІ 18 – 19

Тэма: "Творчая работа на вольную тэму".

Мэта: удасканальваць веды дзяцей аб дзейнасці трох майстроў, аб выяўленні настрою, характару, пачуццяў мастака ў яго творах; развіваць уменне творча выкарыстоўваць назіранні і фантазію ў мастацка-практычнай дзейнасці; замацоўваць тэхналогію выканання работ; выхоўваць зацікаўленнасць у дасягненні канчатковых вынікаў задумы.

Абсталяванне: наглядны матэрыял па трох відах мастацкай дзейнасці, разнастайныя матэрыялы і інструменты для працы.

Змест. Пасля гутаркі аб трох відах мастацтва (выяўленні, упрыгожванні, канструяванні), абмяркоўваюцца і удакладняюцца неабходныя для ажыццяўлення задум дзяцей прыемы працы, матэрыялы. Потым вучні самастойна выконваюць кантрольную творчую работу.

Настаўнік аналізуе работы, дае парады па выпраўленню магчымых памылак.

Заданне на дом: аформіць работы для класнай выставы.

УРОК 20

Тэма: "Паўтарэнне і абагульненне ведаў за чвэрць". Гутарка.

Мэта: замацаваць веды аб адлюстраванні, упрыгожванні, канструяванні, аб выказванні пачуццяў, настрою, характару ў мастацкіх вобразах; пашыраць уяўленні дзяцей аб сумеснай рабоце майстроў ва ўсіх відах мастацка-творчай дзейнасці; удасканальваць навыкі творчага аналізу работ; выхоўваць цікавасць да мастацтва і мастацкай дзейнасці.

Абсталяванне: выстава творчых работ вучняў за чвэрць.

Змест. Урок праходзіць у выглядзе гульні "Мастакі і гледачы". Выконваючы ролі экскурсаводаў, дзеці практыкуюцца ў правядзенні аналізу мастацкіх твораў, узгадваюць спецыяльную лексіку. Пад час правядзення разнастайных віктарын, гульняў вучні замацоўваюць веды аб відах мастацтва, іх асаблівасцях, рэальнасці і фантазіі ў мастацкім вобразе.

Заданне на дом: скласці дызайн-праект "Горад маёй мары".

IV ЧВЭРЦЬ

Як гаворыць мастацтва (мова мастацтва)

На ўроках IV чвэрці другакласнікі засвойваюць паняцці "колер", "форма", "кампазіцыя". Яны вучацца творча выкарыстоўваць назіранні і фантазію пад час адлюстравання, упрыгожвання, пабудовы, прымяняючы пры гэтым разнастайныя выразныя сродкі (колер, лініі, аб'ём, рытм, кантраст і г.д.).

У працэсе вывучэння матэрыялу па выяўленчаму мастацтву школьнікі атрымліваюць веды аб

колерах (асноўных, састаўных, халодных, цёплых, кантрастных), колеравым радзе, эмацыянальным змесце кожнага колеру.

Значная ўвага надаецца засваенню вучнямі паняццяў аб форме і яе асаблівасцях у галіне вылўлення, упрыгожвання, канструявання, набыццю навыкаў карыстання формай як адным са сродкаў стварэння мастацкага вобраза.

Дзеці усведамляюць, што мастацкімі выразнымі сродкамі майстар стварае свет разнастайных вобразаў, ў якіх адлюстроўвае свае бачанне рэчаіснасці. Мова мастацтва становіцца школьнікам зразумелай і даступнай. Працэс творчай дзейнасці дапамагае ім адчуць узаемасувязь паміж мастаком і навакольным асяроддзем.

УРОК 1

Тэма: "Колер (цёплы, халодны), кантраст". Маляванне.

Мэта: даць дзецям уяўленне аб цеплых і халодных колерах, якія прымяняюць мастакі для выказвання пачуццяў і стварэння мастацкіх вобразаў; вучыць карыстацца кантрастнымі колерамі для адлюстравання эмацыянальных кантрастаў; развіваць уменне атрымліваць розныя колеравыя спалучэнні; выхоўваць цікавасць да работы с фарбамі.

Абсталяванне: творы мастакоў, слайды з адлюстраваннем замалёвак, у якіх спалучаюцца цёплыя і халодныя колеры (асенняя лістота на фоне халоднага блакітнага неба, касцёр з жоўта-аранжавым полымем і шэры попел і інш.), "Колеравы круг", папера белага колеру, аловак, фарбы, гуаш.

Змест. Настаўнік расказвае вучням казку:

– Кожны год, калі на змену халоднай зіме прыходзіць цёплая вясна, сустракаюцца дзве сяброўкі – Снягурка і Вяснянка. І тады наваколле пачынае квітнець іх любімымі фарбымі. Снягурка кідае ў іх чароўную сінюю льдзінку, і яны становяцца халоднымі. Вяснянка запальвае фарбы промнем сонечнага колеру, і ад іх пачынае патыхаць сонечнай цеплынёй. Гуляючы, размяшчаюць дзяўчынкі побач халодны і цёплы колеры, і фарбы ад такога суседства становяцца яркімі, выразнымі, сакавітымі. Што ж гэта за фарбы?

Пры дапамозе нагляднага матэрыялу вучні засвойваюць паняцці "халодны", "цёплы" колер, іх эмацыянальную характарыстыку, потым выконваюць практыкаванні "Падбяры колер" і "Каляровая мазаіка".

Узгадаўшы правілы змешвання фарбаў для атрымання неабходных колераў, дзеці прыступаюць да самастойнай дзейнасці. Яны складваюць папалам ліст паперы і выконваюць два малюнкі-дыванкі: дыванок "Снягурка" (сумны, халодны і дыванок "Вяснянка" (цёплы, пяшчотны). Вынікі ўрока падводзяцца ў форме адказаў на пытанні: з якімі колерамі пазнаёміліся? Які настрой і пачуцці пры дапамозе іх можна адлюстраваць? Як атрымаць халодныя (цеплыя) фарбы?

Заданне на дом: малюнак на тэму: "Якім я ўбачыў свет праз блакітнае шкло".

УРОК 2

Тэма: "Колеравы рад". Маляванне.

Мэта: пазнаёміць вучняў з паняццем "колеравы рад" і парадкам колераў у спектры; вучыць атрымліваць кантрастныя спалучэнні колераў, удасканальваць навыкі работы гуашавымі і акварэльнымі фарбамі; выхоўваць уменне працаваць акуратна.

Абсталяванне: рэпрадукцыі з карцін, фотаздымкі з адлюстраваннем вясёлкі, малюнкі настаўніка, табліца "Колеравы круг", папера белага колеру, фарбы.

Змест. Пры праверцы дамашняга задання ўдакладняецца паняцце аб цёплых і халодных колерах, аналізуюцца 2–3 работы вучняў. У наступнай гутарцы ўзгадваюцца асноўныя колеры, уводзіцца паняцце "колеравы рад". Вучні расказваюць, як змешваюцца фарбы для атрымання састаўных колераў, падбіраюць пары колераў па кантрасту, напрыклад: чырвоны – зялёны, аранжавы – сіні, жоўты – фіялетавы.

Выкарыстоўваючы загадкі або вершы і наглядны матэрыял, настаўнік знаёміць дзяцей з мастацкім вобразам вясёлкі, аналізуюцца колеры, з якіх яна складаецца. Прыёмы малявання дэманструюцца на дошцы, пасля чаго вучні самастойна малююць вясёлку, пачынаючы з верхняй, чырвонай дугі.

Пад час аналізу работ замацоўваюцца паняцці "асноўныя колеры", "састаўныя колеры", "колеры вяселкі", кантрастныя колеры", "колеравы рад".

УРОК 3

Тэма: "Каляровая гама (каларыт)". Маляванне.

Мэта: даць дзецям уяўленне аб колеравай гаме (каларыце); пазнаёміць з глухімі і звонкімі адценнямі колераў; замацаваць паняцце аб тым, што колер адлюстроўвае настрой выявы; удасканальваць навыкі работы з фарбамі.

Абсталяванне: рэпрадукцыі з карцін М. Рэрыха "Нябесны бой", І. Левітана "Вялікая вада", В. Цвіркі "Блакітны дзень", малюнак настаўніка, тэматычныя слайды, папера белага колеру, аловак, фарбы гуаш.

Змест. Правяраючы дамашняе заданне, настаўнік нагадвае звесткі пра колеры, колеравы рад. Наступная гутарка суправаджаецца разглядваннем слайдаў, рэпрадукцый з карцін мастакоў. Дзеці засвойваюць, што колеры надаюць выявам пэўны настрой, яны могуць быць чыстымі, звонкімі, глухімі. Настаўнік паказвае, як надаць колеру цёплае або халоднае адценне; змяніўшы колеравую гаму, мы зменім змест і настрой малюнка. Змешваючы асноўныя фарбы з белай або чорнай, вучні знаёмяцца з уласцівасцю фарбаў мяняць гучнасць. Звяртаецца ўвага і на варыянты насычанасці колеру.

Колеравая гама для адлюстравання настрою мастацкага вобраза (вясёлага, сумнага, добрага, злоснага, пяшчотнага, змрочнага) абмяркоўваецца і падбіраецца калектыўна. Пад час самастойнай дзейнасці школьнікі робяць дыванкі, выбіраючы гаму колераў, адзіную па каларыту адценняў.

Аналіз работ суправаджаецца расказам вучняў аб прыёмах работы, замацаваннем ведання мастацкіх тэрмінаў.

Заданне на дом: малюнак на тэму "Мая гама" – дыванок з каляровых палосак.

УРОК 4

Тэма: "Пляма (рытм, кантраст)". Выяўленне.

Мэта: даць вучням уяўленне аб пляме як важным сродку выяўлення мастацкага вобраза, яго характары, настроі, развіваць уменне састаўляць фармальную кампазіцыю на плоскасці (згушчэнне, чаргаванне, рытм, кантрастныя плямы); вучыць дамалёўваць, "ажыўляць" выпадковыя плямы, надаваць ім падабенства да рэальнага прадмета, з'явы і да т.п.; выхоўваць цікавасць да работы з элементамі манатыпіі.

Абсталяванне: дапаможныя малюнкі настаўніка, белая і каляровая папера, аловак, фарбы гуаш, нажніцы, клей.

Змест. Ва ўступнаў гутарцы з выкарыстаннем дзіцячых работ, якія яны зрабілі дома, нагадваюцца звесткі пра колер і яго ўласцівасці, лініі, аб'ём, сілуэт, рытм. Дзеці даведваюцца, што рытм (паўтарэнне, чаргаванне каляровых плям, ліній, форм і да т.п.) стварае асобы настрой малюнка, напрыклад: раўнамерны – выклікае зладжанасць пачуццяў, нераўнамерны, хаатычны – пачуццё трывогі, страху. Па ходу тлумачэння настаўнік размяшчае на дошцы элементы кампазіцыі. У якасці трэніровачнага практыкавання выкарыстоўваецца гульня "Кляксаграфія". Вучні дамалёўваюць, "ажыўляюць" кляксы, расказваюць, да чаго яны падобны. Пад час самастойнай дзейнасці дзеці робяць аплікацыю на тэму " Дзіўныя жывёлы", якую можна выконваць у тэхніцы абрыўнай аплікацыі, карыстацца фарбамі.

Настаўнік аналізуе некалькі работ вучняў, асаблівую ўвагу звяртае на валоданне дзецьмі навыкамі фармальнай кампазіцыі.

Заданне на дом: малюнак на тэму "Прыгоды кляксы" – дамаляваць пляму, прыдумаць гісторыю.

УРОК 5

Тэма: "Лінія (характар, рытм)". Маляванне.

Мэта: даць вучням уяўленне аб лініях як важным сродку выказвання настрою выявы; фарміраваць навыкі валодання лініяй, уменне выкарыстоўваць разнастайнасць ліній для перадачы настрою, характару малюнка; выхоўваць цікавасць да графікі, развіваць творчасць дзяцей.

Абсталяванне: графічныя работы мастакоў, галінкі розных дрэў, дапаможны малюнак настаўніка, белая ці каляровая папера, аловак, туш, фламастэры.

Змест. Уступная частка ўрока адводзіцца для праверкі дамашняга задання. Вучні расказваюць аб прыёмах працы, якімі карысталіся прыстварэнні малюнкаў, адзначаюць лепшыя работы.

Па прапанове настаўніка дзеці разглядваюць жывыя галінкі розных дрэў, вучацца вызначаць іх эмацыянальную выразнасць. Узгадваюцца графічныя матэрыялы працы, іх магчымасці, выразныя сродкі, пры дапамозе якіх у графіцы ствараецца мастацкі вобраз, перадаецца настрой і характар выявы. Асаблівая ўвага надаецца выпрацоўцы тэхнікі карыстання графічнымі прыладамі, бо выразнасць ствараемага вобраза залежыць ад сілы націску імі на паверхню ліста. Настаўнік дэманструе прыёмы працы алоўкам, фламастэрам, вугалем на дошцы.

Самастойна школьнікі малююць галінку дрэва, ствараючы мастацкі вобраз з пэўным характарам (вясёлым, сумным, пяшчотным). Стварыць паэтычную атмасферу дапамогуць нерыфмаваныя японскія вершы з трох радкоў:

З галінкі на галінку
Павольна збягаюць кроплі. . .
Дождж вясенні.

Свае работы вучні аналізуюць самі. Настаўнік удакладняе аналізы дзяцей, дабіваецца, каб другакласнікі карысталіся спецыяльнай тэрміналогіяй.

Заданне на дом: зрабіць замалёўку цацкі простай формы.

УРОК 6

Тэма: "Форма ў выяўленні. Цацкі". Лепка.

Мэта: пашыраць уяўленні вучняў аб форме ў адлюстраванні на плоскасці і ў аб'ёме; даць паняцце аб разнастайнасці форм: круглай, прамавугольнай, трохвугольнай, аб'ёмнай (шар, куб); удасканальваць навыкі работы з пластылінам (глінай); развіваць творчую актыўнасць.

Абсталяванне: цацкі рознай формы (мячы, кубікі дэкаратыўныя, некуляшка, мішка, калабок), пластылін (гліна), стэкі.

Змест. На падставе работ, якія дзеці выконвалі дома, і нагляднага матэрыялу ўзгадваюцца і пашыраюцца веды вучняў аб форме прадметаў рэчаіснасці: плоскай, аб'ёмнай, геаметрычнай, прыроднай. Праводзіцца гульня "Розныя формы вакол нас". Дзеці робяць вусныя замалёўкі прадметаў навакольнага свету, стараюцца апісаць дакладна іх форму.

Настаўнік нагадвае і паказвае прыёмы і спосабы лепкі цацак, дапамагае вучням вызначыць паслядоўнасць этапаў работы. Цацкі рознай формы яны лепяць самастойна, потым аздабляюць іх каляровым пластылінам.

Аналіз работ суправаджаецца паведамленнямі вучняў аб прыёмах лепкі і формах выяў, якія яны зрабілі.

Заданне на дом: зрабіць замалёўкі разнастайных па форме аздабленняў.

УРОК 7

Тэма: "Форма і стыль ва ўпрыгожванні. Адзенне для лялек". Упрыгожванне.

Мэта: фарміраваць уяўленні дзяцей аб асноўных формах у дэкаратыўным мастацтве; даць паняцце аб сіметрычных і асіметрычных формах у прыро-

дзе і мастацтве; удасканальваць навыкі работы з гуашавымі фарбамі, выхоўваць самастойнасць, жаданне дабівацца ў працы станоўчых вынікаў.

Абсталяванне: альбомы па дэкаратыўнаму мастацтву, колеравыя табліцы, белая і каляровая папера, гуашавыя фарбы, нажніцы, клей.

Змест. Пад час праверкі дамашняга задання замацоўваюцца веды дзяцей аб асноўных формах у прыродзе і мастацтве. З уступнай гутаркі да тэмы ўрока школьнікі даведаюцца аб тым, што фантазія мастака пераўтварае прыгажосць прыроды ў прыгажосць хвалістага ўзора карункаў, вышыўкі, роспісу. Выкарыстоўваючы наглядны матэрыял, настаўнік знаёміць дзяцей з сіметрычнымі і асіметрычнымі формамі ў прыродзе і творах мастацкай дзейнасці, паказвае, як прыгажосць узора залежыць ад формы яго элементаў, спалучэння колеравай гамы.

Па прапанове настаўніка вучні знаходзяць элементы прыроды для свайго ўзора, стылізацыі, выкарыстоўваючы лісце, кветкі, матылькоў і да т.п. Некалькі варыянтаў узора абмяркоўваюцца, адзначаецца форма дэталей, спалучэнне колераў. Узор на адзенні для лялек школьнікі робяць самастойна. Працаваць дазваляецца ў любой тэхніцы: роспісе, аплікацыі, выцінанцы.

Крытэрыем аналізу з'яўляюцца кампазіцыя ўзора, спалучэнне колераў і формы дэталей.

Заданне на дом: падрыхтаваць гатовыя формы для канструявання вырабаў.

УРОК 8

Тэма: "Форма ў канструяванні". Канструяванне.

Мэта: фарміраваць уяўленні вучняў аб форме ў канструяванні; вучыць знаходзіць адпаведныя аналогіі ў прыродзе і мастацтве, дапаўняць асноўныя канструкцыі істотнымі, характэрнымі дэталямі; удасканальваць навыкі канструявання з паперы і кардону; выхоўваць цікавасць да творчай працы.

Абсталяванне: вырабы майстроў, тэматычныя фотаздымкі і малюнкі, белая і каляровая папера, кардон, гатовыя формы (каробкі, шкатулкі і да т.п.), нажніцы, клей, аловак.

Змест. Арганізуецца выстава вырабаў з паперы, кардону, у ходзе якой аналізуецца іх форма, абмяркоўваецца магчымасць выкарыстання гатовых форм для вырабу цацак-самаробак. Знаёмяцца вучні і з работамі майстроў-дызайнераў. Узгадваюцца прыёмы працы з кардонам, паперай і гатовымі формамі, якія можна выкарыстаць пры канструяванні розных вырабаў.

Для практычнай дзейнасці школьнікам прапануецца самастойна выбраць выраб, яго форму, прадумаць упрыгожванне.

У канцы ўрока вучні абараняюць свае работы. Адзначаюцца станоўчыя і адмоўныя якасці вырабаў, звяртаецца ўвага на іх практычнасць, вобразнасць і прастату.

Заданне на дом: скласці невялічкае апавяданне на тэму: "Фарбы вясны".

УРОК 9

Тэма: "Кампазіцыя ў маляванні (колер, пляма, лінія, кантраст і г.д.). Вясна". Маляванне.

Мэта: паўтарыць і замацаваць веды вучняў па тэме "Мова мастацтва"; вучыць выкарыстоўваць у творчай кампазіцыі разнастайныя выразныя мастацкія сродкі (колер, лініі, кантрастнасць, рытм і інш.); выхоўваць мастацкае ўяўленне, самастойнасць.

Абсталяванне: рэпрадукцыі з карцін мастакоў з адлюстраваннем вясновых пейзажаў, музычныя творы на тэму вясны, папера белага колеру, аловак, фарбы гуаш.

Змест. Пад музыку дзеці расказваюць апавяданні на тэму "Фарбы вясны", якія прыдумалі самі. Настаўнік удакладняе і абагульняе выказванні вучняў. У наступнай гутарцы засвойваецца паняцце аб кампазіцыі ў мастацтве. Разглядваюцца і аналізуюцца рэпрадукцыі з карцін, вызначаюцца асноўныя выразныя сродкі мастакоў-пейзажыстаў для адлюстравання кампазіцыйнай задумы (колер, пляма, кантрастнасць, рытмічнасць і інш.). Асаблівая ўвага звяртаецца на разнастайныя вырыянты кампазіцыйнага вырашэння малюнка, узгадваецца паслядоўнасць работы пры адлюстраванні пейзажных сюжэтаў.

Пасля абмеркавання варыянтаў магчымых кампазіцый на тэму "Вясна" дзеці пад кіраўніцтвам настаўніка робяць эскізы малюнкаў алоўкам. Яны вызначаюць галоўныя дэталі кампазіцыі (неба, сонейка, птушкі, дрэва і да т.п.), прыгожа размяшчаюць іх на плоскасці ліста. Школьнікі выконваюць кампазіцыю ў колеры і дапаўняюць яе дадатковымі дэталямі самастойна.

У канцы ўрока настаўнік аналізуе некалькі работ, адзначае недахопы і недакладнасці кампазіцыйнага вырашэння малюнкаў, падказвае, як іх выправіць.

Заданне на дом: выправіць дапушчаныя ў малюнку недахопы, дапоўніць неабходным фонам.

УРОК 10

Тэма: "Аб'ём і пластыка (мова скульптуры). Фігуркі жывёл". Лепка.

Мэта: пазнаёміць вучняў з асноўнымі выразнымі сродкамі скульптуры; удасканальваць прыёмы і спосабы лепкі; вучыць бачыць і разумець узаемасувязь частак кампазіцыі; выхоўваць цікавасць і павагу да прафесіі скульптара.

Абсталяванне: народныя гліняныя цацкі, рэпрадукцыі з адлюстраваннем розных скульптурных кампазіцый, пластылін (гліна), стэкі.

Змест. Ва ўступнай гутарцы з выкарыстаннем нагляднага матэрыялу настаўнік знаёміць дзяцей з асноўнымі выразнымі сродкамі скульптуры: пластыкай, аб'ёмам, фактурай, тонам. Пры разглядванні адлюстравання жывёл увага звяртаецца на індывідуальныя асаблівасці кожнай выявы: позу, будову цела, рух, характар.

Узгадаўшы галоўныя этапы работы і асноўныя прыёмы лепкі, вучні прыступаюць да самастойнай

дзейнасці. Яны лепяць фігуру жывёлы па выбару, стараючыся захаваць асноўныя прапорцыі частак цела, характэрную позу звярка.

У канцы ўрока арганізуецца выстава работ. Вучні аналізуюць іх самі.

Заданне на дом: распісаць фігуркі гуашавымі фарбамі, пры магчымасці пакрыць іх лакам.

УРОК 11

Тэма: "Кампазіцыя ва ўпрыгожванні (рытм, колер, пляма і г.д.). Папараць-кветка". Роспіс.

Мэта: вучыць дзяцей правільна састаўляць дэкаратыўную кампазіцыю ў працэсе ўпрыгожвання, творча выкарыстоўваць у рабоце разнастайныя выразныя сродкі (рытм, колер, фон і інш.); удасканальваць уменне прымяняць дапаможныя лініі, падбіраць форму элементаў роспісу, колер; выхоўваць цікавасць да дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці.

Абсталяванне: узоры арнаментаў на раслінныя матывы, дапаможныя малюнкі настаўніка, папера белага колеру, аловак, фарбы гуаш.

Змест. Уступная гутарка аб дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, яго выразных сродках, сувязі з прыродай. Узгадваецца паняцце аб арнаменце, яго асаблівасцях. Аналізуючы ўзоры арнаментаў, дзеці прыходзяць да высновы аб багацці і прыгажосці раслінных матываў, што выкарыстоўваюцца ў мастацка-дэкаратыўнай дзейнасці. Адзначаюцца асноўныя элементы ўзораў раслінай кампазіцыі.

Настаўнік расказвае гісторыю аб папараць-кветцы, якая расцвітае толькі ў купальскую ноч. Кветка прыносіць чалавеку, які знайшоў яе, шчасце, дае магчымасць разумець мову дрэў, раслін, птушак і звяроў. Абмеркаваўшы прыёмы работы ў працэсе роспісу, вучні самастойна выконваюць кампазіцыю "Папараць-кветка" спачатку алоўкам, потым падбіраюць колер для фону (ён павінен быць цямнейшым за кветку). Дэталі малюнка акуратна дамалёўваюцца, калі высахне фонавая фарба.

Праводзіцца выстава і калектыўны аналіз работ. Настаўнік удакладняе аналізы вучняў, падводзіць вынікі заняткаў.

Заданне на дом: прыдумаць казку аб чароўнай кветцы.

УРОК 12

Тэма: "Кампазіцыя ў канструяванні". Канструяванне.

Мэта: даць дзецям уяўленне аб кампазіцыі ў канструяванні; вучыць творча выкарыстоўваць назіральнасць і фантазію ў працэсе працоўнай дзейнасці; развіваць уменне выказваць праз канструкцыю свае адносіны да вырабу; выхоўваць імкненне да стваральнай працы.

Абсталяванне: фотаздымкі, рэпрадукцыі, малюнкі з адлюстраваннем розных машын, самалетаў, архітэктурных збудаванняў, аловак, папера, кардон, нажніцы, клей.

Змест. Уступная частка ўрока адводзіцца на праверку дамашняга задання. Дзеці расказваюць гісторыі пра чароўную кветку, узгадваюцца і замацоўваюцца паняцці аб мастацкіх выразных сродках у адлюстраванні з'яў і прадметаў рэчаіснасці.

Наступная гутарка ўзнаўляе веды вучняў пра мастацкі вобраз у канструяванні, які ствараецца шляхам спалучэння характару агульнага сілуэта, суадносін памераў канструкцыі і дэкаратыўных элементаў. Пры дапамозе нагляднага матэрыялу засвойваюцца выразныя сродкі канструявання машын, самалетаў, розных збудаванняў, вызначаецца работа майстроў дэкору і дызайну.

Пад час самастойнай дзейнасці дзеці працуюць над стварэннем мастацкага вобраза машыны, самалета або будынка, з якіх састаўляецца адзіная кампазіцыя.

Аналізуюцца і абмяркоўваюцца макеты канструкцый і агульнай кампазіцыі калектыўна. Настаўнік падводзіць вынікі абмеркавання.

Заданне на дом: зрабіць замалёўку старажытнага горада.

УРОК 13

Тэма: "Аб'ём і канструкцыя ў архітэктуры. Старажытны горад." Канструяванне.

Мэта: удасканальваць навыкі працы ў канструяванні і ўменне выкарыстоўваць для выказвання эмацыянальнага настрою рытм, аб'ем, прапорцыі і іншыя выразныя сродкі; развіваць прасторавыя ўяўленні, здольнасць ствараць аб'емную кампазіцыю ў прасторы; выхоўваць чуласць да прыгажосці, гармоніі старадаўняй архітэктуры.

Абсталяванне: слайды, фотаздымкі, малюнкі дзяцей з адлюстраваннем старажытнай архітэктуры, разнастайныя матэрыялы для канструявання (гатовыя геаметрычныя формы з кардону і паперы, каробкі розных памераў, запалкі, палачкі і да т.п.), клей.

Змест. Ва ўступнай гутарцы настаўнік знаёміць вучняў з узорамі старажытнай архітэктуры Беларусі. Адзначаюцца асноўныя асаблівасці збудаванняў, абмяркоўваюцца прыемы работы з матэрыялам для канструявання.

Кожны вучань самастойна стварае мастацкі вобраз старажытнага замка, палаца або вежы. Індывідуальныя канструкцыі аб'ядноўваюцца ў агульную кампазіцыю старажытнага горада. Настаўнік аналізуе калектыўную работу і падводзіць вынікі ўрока.

Заданне на дом: скласці невялічкае апавяданне на тэму "Як гаворыць мастацтва".

УРОК 14

Тэма: "Паўтарэнне і абагульненне матэрыялу за год". Гутарка.

Мэта: паўтарыць матэрыял, вывучаны на працягу года, замацоўваць уменне дзяцей аналізаваць творчыя работы; умацоўваць эмацыянальныя сувязі школьнікаў паміж уласнай выяўленчай дзейнасцю і светам выяўленчага мастацтва.

Абсталяванне: творчыя работы вучняў па ўсіх відах мастацкай дзейнасці.

Змест. Перад урокам афармляецца выстава дзіцячых работ за год па адлюстраванню, упрыгожванню, канструяванню. Арганізуецца гульня "Экскурсаводы". Тры вучні ў якасці экскурсаводаў выбіраюць сабе памочнікаў і расказваюць аб творчай дзейнасці трох майстроў мастацтва – адлюстравання, упрыгожвання, канструявання. У гульні "Экзамен" вучні падзяляюцца на 4 групы (па колькасці чвэрцей), кожная група атрымлівае карткі з пытаннямі, якія датычацца пройдзенага за адну чвэрць матэрыялу. Карткі маюць сваю адметную форму і колер.

Абмеркаваўшы адказы на пытанні, прадстаўнікі ад кожнай групы "здаюць" экзамены.

У заключнай гутарцы "Ты і мастацтва" дзеці раскрываюць змест творчых работ, якія выбірае настаўнік, адказваюць на пытанні.



СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Алексеева В.В. Что такое искусство? Вып. 1, 2, М., 1973; 1979.
2. Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993.
3. Белорусская советская живопись: Альбом /Сост. А. В. Аладова. Мн., 1978.
4. Волков И.П. Приобщение школьников к творчеству: Из опыта работы. М., 1982.
5. Выготский Л.С. Воображение и творчество в детском возрасте. 2–3-изд. М., 1967.
6. Глинская И.П. Изобразительное искусство. Методика обучения в 1–3 классах. К., 1978.
7. Горяева И. Первые шаги в мире искусства. М., 1991.
8. Зубарева Н.М. Дети и изобразительное искусство. М., 1969.
9. Изобразительное искусство в начальных классах / Под ред. Б.П. Юсова, Н.Д. Минц. Мн., 1992.
10. Костерин Н.П. Учебное рисование. М., 1980.
11. Кирилло А.А. Учителю об изобразительных материалах. М., 1971.
12. Конышева Н.М. Лепка в начальных классах: Пособие для учителей. М., 1980.
13. Кузин В.С. Методика преподавания изобразительного искусства в 1–3 классах: Пособие для учителей. М., 1979.
14. Лазука Б.А. Гісторыя мастацтваў: Вучэбны дапаможнік. Мн., Беларусь, 1996.
15. Левин С.Д. Ваш ребенок рисует. М., 1979.
16. Мухина В.С. Изобразительная деятельность ребенка как форма усвоения социального опыта. М., 1981.
17. Неменский Б.М. Мудрость красоты: Книга для учителя. 2-е изд. М., 1987.
18. Популярная художественная энциклопедия: В 2 т. М., 1986.
19. Прачкіс Г.К. Рысаванне ў пачатковых класах. Мн., 1978.
20. Претте М.К., Копальдо А. Творчество и выражение. Вып. 1. 2. М., 1981; 1985.
21. Рожкова Е.Е. Изобразительное искусство в начальной школе. М., 1980.
22. Розенвассер В.Б. Беседы об искусстве. М., 1979.
23. Сахута Е.М. Народное искусство и художественные промыслы Белоруссии. Мн., 1982.
24. Школа изобразительного искусства. Вып. 1–10, 2-е изд. М., 1965–1968.
25. Энциклопедический словарь юного художника. М., 1989.
26. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.

ЗМЕСТ

УСТУП 3

I чвэрць. Чым і як працуюць мастакі? 5

II чвэрць. Сакрэты майстроў 10

III чвэрць. "Аб чым гаворыць мастацтва" 14

IV чвэрць. "Як гаворыць мастацтва".
(мова мастацтва) 19

СПІС ЛІТАРАТУРЫ 25

Навукова-метадычнае выданне

Данілаў Віктар Мікалаевіч

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА І ПРАЦА

Тэматычнае планаванне

2 клас

Зак. 989